Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок шапарэлі пасярод тэксту 1 р. — к.
За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьмешныя на 50 проц. дарожэй.
Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 лікумэт . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўным і чырвонаармейцам за лікумэт . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыя ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 16 (2505) Нядзеля, 20-га студзеня 1929 г.

ПЯЦЬ ГОД З ДНЮ СЬМЕРЦІ У. І. ЛЕНІНА.

(21 СТУДЗЕНЯ 1924 ГОДУ—21 СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ).

За пяць год--па заветах Леніна--будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне магутна ўзрасло. На выпрабаваным ленінскім шляху мы даб'ёмся поўнай пабеды сацыялізму.

Як ажыцьцяўляюцца заветы Ільліча.

(З артыкулу тав. М. Галадзеда).

Заветы Ільліча, яго лёзунгі знайшлі яскравае ўвасабленьне ў тых вялікіх колькасных і якасных дасягненьнях, якія мы можам упэўнена падагуліць у пятую гадавіну з дня сьмерці нашага вялікага настаўніка.

Годы грамадзянскай вайны, перыяд 1918-1921 г. г., былі гадамі найбольшага заняпаду вытворчых сіл нашай гаспадаркі ва ўсіх галінах. З пераходам да новай эканамічнай палітыкі, прапанаванай краіне гэніем Уладзіміра Ільліча, пачынаецца найвяліцшая ў гісторыі творчасьць шырокіх рабочых і сялянскіх мас па ўзьняцьцю народнай гаспадаркі з заняпаду і разрухі. І разьвіцьцё народнай гаспадаркі пайшло шпаркім крокам наперад, невядомым капіталістычным краінам.

«Расея нэпаўская будзе Расеяй сацыялістычнай» — сказаў Ленін у апошняй сваёй прамове, зробленай 19 лістапада 1922 г.

Глыбокае прадбачэньне Ільліча цалкам апраўдалася.

За мінулае пяцігодзьдзе прадукцыя нашае рэспубліканскае прамысловасьці павялічылася на 230 проц., валавая ж прадукцыя за мінулы 1927-28 год у параўнаньні з ранейшым годам па ўсёй прамысловасьці складае 275,2 млн. руб., па цэнах 1926-27 г. і вырасла за год на 20,9 проц. Рабочая сіла за мінуўшае пяцігодзьдзе ўзрасла на 211 проц. Зарплата за апошнія два гады падняслася на 39 проц.

Пры ўсім гэтым характэрна, што прамысловасьць Беларусі пераходзіць паступова, але даволі энэргічна, на новую тэхнічную базу. Аб гэтым гавораць даныя, хоць б і аб выпрацоўцы і спажываньні энэргіі. Калі ў 1913 г. на аднаго жыхара БССР спажывалася ня больш 0,3 кілёват гадзін, дык у 1926/27 г. гэта лічба ўзрасла да 55 к. гадзін.

Асінаўская Цэнтральная Электрастанцыя, якая павінна быць скончана ў 1930 годзе, зьяўляецца кардынальным мерапрыёмствам, якое падводзіць новую энэргетычную і тэхнічную базу ня толькі пад існуючую прамысловасьць, але забясьпечваючым магчымасьць пабудовы значнае колькасьці новых буйных прадпрёмстваў. Збытак тарфяных балот з добрае якасьці торфам дае магчымасьць у далейшым шпаркім тэмпам разьвіваць электрыфікацыю БССР.

Бюджэтныя даныя мяюць той тэмп па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і інтэнсіфікацыі яе, які праводзіцца ўрадам БССР: у зьвышная вага сродкаў, укладаемых у сельскую гаспадарку Беларусі, насуп. складаўшы ў 1925-1926 г. 29,3 проц. усіх выдаткаў па бюджэту, бязупынна павышаючыся, вырас у 1927-28 г. да 28,3 проц. У абсалютнай суме ўклады ў сельскую гаспадарку ў бягучым гаспадарчым годзе складаюць 34,6 млн. руб. супроць 21,8 мілл. руб. у 1927-28 г.

Дынаміка сельскае гаспадаркі за апошнія гады характарызуецца наступнымі данымі: валавая прадукцыя ўзрасла ў 1926/27 г. у параўнаньні з 1925-26 годам на 15 проц. і складае 744144 тыс. руб. Засеўная плошча складае 125,8 проц. плошчы даваеннага часу. Рост буйнае рагатае жывёлы складае ў 1927/28 г. у процантах да 1916 г. 141,3. Цягавая сіла (рабочая жывёла) у параўнаньні з 1919 г. складае 123,2 проц. На працягу апошніх год адбываюцца нязьменныя працэсы зьмены мэтадаў апрацоўкі зямлі ў бок павышэньня тэхнічнага ўзроўню, а таксама адбываецца сыстэматычнае аднаўленьне сельска-гаспадарчага інвэнтару.

У параўнаньні з даваенным часам мы маем вялічэзны культурны рост. Ня кажучы ўжо аб вышэйшай асьвеце ў вышэйшых навучальных установах, якіх Беларусь мае ўжо 4, а да рэвалюцыі ня мела ніводнае, ня кажучы ўжо аб шэрагу навуковых устаноў на чале з Беларускай Акадэміяй Навук, ідзе шпаркі рост пісьменнасьці. Водаўг даных дэмаграфічнага перапісу, рост пісьменнасьці за 1920/26 гады складае 26 проц. Тэмп росту пісьменнасьці ў Беларусі ідзе таксама больш шпарка, чымся ў некаторых іншых саюзных рэспубліках, хоць, між іншым, па агульнаму процанту пісьменных яна ўсё яшчэ адстае. Як першы буйны посьпех у гэтай справе, трэба адзначыць, што з бягучага году па буйнейшай акрузе БССР, Менскай, ужо ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне.

Вышэйпададзеныя факты даволі яскрава сьведчаць аб тым, як шпарка і няўхільна разьвіваецца народная гаспадарка і культура ў Савецкай Беларусі. Правільна ажыцьцяўляемая нацыянальная палітыка партыі і савецкага ўраду дае яскравыя ўзоры дружнае супольнае працы пралетарыяту ўсіх нацыянальнасьцяй, які вядзе за сабою асноўныя масы сялянства, будуючы сацыялізм па заветах вялікага правадыра і настаўніка Леніна.



БЯЗ ЛЕНІНА, АЛЕ ПА-ЛЕНІНСКУ.

(Анкета сярод прадстаўнікоў чужаземных кампартый).

Пад сьцягам ленінізму гэтыя пяць год былі пяцю гадамі бязупыннага ўмацаваньня савецкай улады. Ажыцьцяўляючы заветы Леніна—індустрыялізацыю і электрыфікацыю краіны—пралетарыят СССР прывёў да перамогі.

ТОМАС БЭЛЛ. (*Англія*).

* * *

Міжнародная рабочая клясa ў сваёй барацьбе за перамогу пралетарскай дыктатуры ва ўсім сьвеце ўжо пяць год пазбаўлена жывога кіраўніцтва Леніна. Але яна ішла няўхільна наперад, дасягаючы ўсё большых посьпехаў, пад разгорнутымі сьцягамі ленінізму. Асабліва яскрава гэта выяўлялася ў вялікіх дасягненьнях шостага сусьветнага кангрэсу Камінтэрну, на якім была створана сусьветная камуністычная праграма, прынятыя пачынаючыя цэлую эпоху пастановы па калёніяльнаму пытаньню, пастановы, прыцягнуўшыя ў шэрагі Камінтэрну новыя камуністычныя партыі; праведзена канкрэтная падрыхтоўка барацьбы супроць пагражаючай ваеннай небясьпекі. Уся гэта праца была прасякнута духам і правільнай бальшавіцкай лініяй ленінізму.

Леніна няма з намі, у нас ёсьць ленінізм: ідучы па ленінскаму шляху, сусьветны пралетарыят заваюе ўладу.

Няхай жыве ленінізм!
Няхай жыве Камінтэрн!
Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

ДЖ. ЛЬЮІС ЭНГДОЛ. (*Злуч. Штаты Паўночн. Амэрыкі*).

* * *

Перадавыя рабочыя Польшчы некалькі дзесяцігодзьдзяў змагаліся рука ў руку з рэвалюцыйнымі рабочымі ўсёй расейскай дзяржавы. А таму імя Леніна ня было чужым для іх; яны ведалі яго яшчэ да Кастрычнікавай рэвалюцыі і да імпэрыялістычнай вайны. Імя Леніна для перадавых рабочых Польшчы было ўвасабленьнем рэвалюцыйнай клясавай ідэалёгіі і непрымірымай барацьбы з буржуазеяй.

Але калі раней імя гэта было дарагім толькі для часткі, для сьвядомых рабочых Польшчы, дык зараз пасьля дзесяцігадовага існаваньня незалежнай польскай дзяржавы, пасьля 10 гадовага ўціску, суровага буржуазнага рэжыму і лютага прасьледваньня рабочага і ўсяго рэвалюцыйнага руху Польшчы—імя гэта зрабілася дарагім для значнай большасьці польскага пралетарыяту, працоўнага сялянства і працоўных прыгнечаных нацыянальнасьцяй Польшчы.

У пятую гадавіну сьмерці вялікага правадыра імя Леніна ў Польшчы, больш чым калі-небудзь, зьяўляецца сымбалем непрымірымай барацьбы для вызрынуцьця буржуазнай улады і ўстанаўленьня пралетарскай дыктатуры.

М. ВАЙТКЕВІЧ. (*Польшча*).

* * *

Няхай жыве Ленін! Гэтыя словы я бачыў ва ўсіх куткох Італіі, напісаныя розымі спосабамі — вуглем ці крэйдай на сьценах дамоў у вёсках Альп, у турме, нават у царкве, у 1926 годзе ў рымскіх катакомбах. Ні адзін чалавек ня быў такім папулярным у Італіі, як Уладзімір Ільліч. Італьянскія рабочыя не паверылі фашыстам аб яго сьмерці, бо рэакцыйны друк ужо шмат разоў каркаў аб гэтым. Сёньня, ня гледзячы на ўціск фашысцкай рэакцыі, італьянскія рабочыя ўспомняць свайго ўлюбёнага правадыра.

ДЖЫАВАНІ ДЖЭРМАНЭТТА. (*Італія*).

* * *

Сьмерць Уладзіміра Ільліча выклікала ў буржуазеі падзеі, якія засталіся неажыцьцёўленымі: мёртвы Ленін пакінуў пралетарыяту непераможную зброю—ленінізм.

Ленін здолеў выказаць і разьвіць вучэньне Маркса стасоўна да эпохі імпэрыялізму. Ён узброіў ім Камінтэрн і УсеКП(б). Тое, што Ленін лічыў важным для перамогі і разьвіцьця расейскай рэвалюцыі па шляху дасацыялізму, ажыцьцяўляецца яго пасьлядоўцамі: індустрыялізацыя і электрыфікацыя бязупынна растуць, каапэрацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі аказваюць магутны ўплыў на жыцьцё краіны. У міжнароднай галіне кампартыі стаяць на больш моцным грунце, чымся раней, і заваёўваюць даверэ пралетарыяту; народы калёніяльных і паўкалёніяльных краін, Лацінскай Амэрыкі і Кітаю арганізавалі свае кампартыі і былі прадстаўлены на 6 сусьветным кангрэсе Камінтэрну. Моцны вучэньнем Леніна, пралетарыят пераможа міжнародную буржуазею.

Няхай жыве ленінізм!

ЖАН КРЭМЭ. (*Францыя*).

* * *

Пяць год бяз Леніна. Цяжка паверыць. Але паглядзім хоць-бы на апошнія вялікія стварэньні Леніна: Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Камуністычны Інтэрнацыянал.

СССР ідзе наперад, ня гледзячы на ўсе вылазкі ўнутраных і замежных ворагаў, разьвіваецца, не зважаючы ні на што, будуе сацыялізм, стварае першую сапраўдную бацькаўшчыну для рабочых усіх краін. Бязупынна правакуючы і падрыхтоўваючы вайну супроць СССР, міжнародны імпэрыялізм пачынае разумець, што гэта інтэрнацыянальная пралетарская бацькаўшчына зьвязана зараз вельмі шчыльна з усім міжнародным пралетарыятам. Гэта таксама вынікі працы Камінтэрну, які ў сакавіку будзе сьвяткаваць свае дзесяцігодзьдзе. Правільная і неабходная барацьба супроць усіх відаў апартунізму, правых ухілаў, ліквідатарства і дзячэйных хвароб левізны, якія вядзе Камінтэрн у міжнародным маштабе, асабліва пасьля 6 кангрэсу, ёсьць працяг ленінскай справы,

А. БАДУЛЕСКУ (*Румынія*).

* * *

Пяць год таму назад, калі памёр У. І. Ленін, нямецкая кампартыя знаходзілася ў падпольлі. Прыгнечаны настрой панаваў сярод нямецкіх рабочых пасьля цяжкага ўдару, які нанесла ў 1923 годзе нямецкая буржуазея рабочай клясе. Сур'ёзныя апартуністычныя памылкі тагочаснага партыйнага кіраўніцтва былі прычынай гэтага паражэньня і прымусілі партыю ў падпольлі адчавіць сваю рэвалюцыйную працу. Без асабістага кіраўніцтва Леніна, які так часта дапамагаў нямецкай КП сваёй палітычнай дальнабачнасьцю і імпэтам сваіх рашэньняў, нямецкая кампартыя павінна была знову шукаць правільнага шляху. І якраз у гэты цяжкі час, пасьля некаторых ваганьняў, партыя здолела знайсьці выхад у ленінскім духу. З гэтага часу, у бязупыннай барацьбе супроць буржуазеі і сацыялдэмакратыі і левых і правых ухілаў, нямецкая кампартыя вырасла ў масавую бальшавіцкую партыю, у лепшую сэкцыю Камінтэрну. У сучасны момант у тым-жа ленінізму вядзе яна рашучую барацьбу з правай небясьпекай, з імпэрыялізмам і пагрозай вайны. За гэтыя пяць год бяз Леніна, але па Леніну, нямецкая кампартыя і рэвалюцыйны пралетарыят прайшлі частку свайго шляху да пралетарскай рэвалюцыі.

ФРЫЦ АПЭЛЬТ. (*Нямеччына*).

А. РОЗНА.

ЧЫРВОНЫ МАЎЗАЛЕЙ.

(Да пяцігодзьдзя сьмерці Леніна).

Дарога цяжкая...
А мы ня чуем стомы,
У сэрцах ня зьлічыць
Расквечаных лілей.
Сягоньня, на жыцьця
В лікім пераломе,
Устаў пера-да-мной
Чырвоны маўзалей...
Пяць год на ім
Пяць гучных літар:
ЛЕНІН.
І гэты сымбаль к сонцу
Ліча шмат людзкіх галоў
Здаецца: Заўтра, заўтра
Расплывуцца цені,
Збудзіць пачуцьцё
Апошні звон аковаў.

Зясна прыгожая
Абнімае сьвет крыламі,
І перастане плакаць
Ля балот трысь ё...
На грудзях сьвету цэлага
Прыляжа васількамі
Такое, як у нас,
Дзівоснае жыцьцё.
Не! Не здаецца мне!
Усё гэта заўтра будзе—

Для помсты гэтай
Ня існуюць берагі—
На дзіўны шлях, як мы раней,
Сягоньня выйдуць людзі.
Чырвоны маўзалей—
Іх сымбаль дарагі!

Цяпер вось на вялізарнай
Маскоўскай вежы,
Гадзіньнік звонам
Ціха грае гімн жыцьця.
Хоць рэкі поўныя крыві
Яшчэ даволі сьвежы,
Але яны плывуць
У дыму забыцьця.

Сядаю дзін.
Газэтны ліст пера-да-мною,
Чытаю: шмат
Ахвяр у барацьбе.
Успомніў я той дзень,
Халодны дзень...
Зімою...
Чырвоны маўзалей!
Успомніў я цябе!

Ніхто ніколі не задушыць
Крык Кітаю,
І гучны голас
«Беларускай Грамады».
Ніхто той голас
Не заглушыць—знаю, знаю,
Бо голас той расьце...
Мінаюцца гады...

Загнаны сьвет ужо
Узьняў свой гучны голас,
І людзі паўстаюць...
Сьпярша адзін...
Другі...
Крывавай сьцежкаю
Ідуць у залатое поле.
Чырвоны маўзалей—
Іх сьветач дарагі.

16-I—1929 г.
Менск.

СПАТКАНЬНЕ З ІЛЬЛІЧОМ

Я першы раз спаткаўся з Леніным раньняй вясной 1921 г. Я праехаў праз Эўропу пры нармальных для таго часу цяжкасьцях, зьвязаных з неле льнасьцю. Каліцыйны ўрад Лёйд-Джорджа—Чэрчыля быў вельмі разгневаны супроць савецкай улады і супроць усіх актыўных прыхільнікаў расейскай рэвалюцыі. Ён ахвотна прапускаў розныя антысавецкія элемэнты, уключаючы ручных рабочых лідэраў, але адмаўляўся выпускаць з Англіі людзей, вядомых як сталыя аднадумцы Леніна.

У той час, калі я прыехаў у Маскву, Ленін заўсёды аддаваў гадзіны дзьве ў дзень для таварыскіх гутарак з прыяжджаўшымі з за межаў членамі братэрскіх партый. У хуткім часе пасьля прыезду мне перадалі, каб я зайшоў да яго пагаварыць. Удвох з адным нарвэскім таварышом мы пашлі да Леніна. Мы засталі яго ў яго габінэце ў Крамлі.

Я мушу сказаць, што хоць я чуў і раней імя Леніна ў сувязі з міжнароднымі сацыялістычнымі кангрэсамі—Амстэрдамскім (1904 г.), Штутгардзкім і г. д., нашы ангельскія рабочыя лідэры ніколі не спаміналі яго ў сваіх прамовах. Такім чынам, для многіх з нас Ленін быў, можна сказаць, „незвядомай велічынёй".

Аднак, мае страхі хутка разьляцеліся. Да выезду з Англіі я працаваў на ліцейным заводзе, атрымаў сацыялістычную адукацыю ў тэорыі і на практыцы і ўмеў разьбірацца ў людзях. Я хутка адчуваў сябе з ім добра. Я ўбачыў, што перада мнёй не гаварлівец або кар'ерысты, а адзін з нас, наш таварыш па рабочаму руху.

Натуральна, мы загаварылі аб Англіі, аб рабочым руху там, аб яго лідэрах, аб некаторых асобах, аб магчымых пэрспэктывах. На мяне рабіла такое ўражаньне, быццам я гутарыў з кім-небудзь з працаўнікоў англійскага руху, так добра ён ведаў усе дэталі.

Мы доўга гутарылі аб ангельскім прафсаюзным руху, асабліва аб гарнятках Паўднёвага Уэльсу, якія выказаліся за Прафінтэрн. Я абяцаў прысылаць яму падрабязныя весткі аб гэтай справе і выканаў сваё абяцаньне.

У гэтай гутарцы аб валійскіх гарнятках Ленін выказаў думку, што калі га някі сапраўды верацъ у Камуністычны Інтэрнацыянал, дык яны павінны быць гатовы траціць паўпені або пені на ўласную газэту. Цікавы яго погляд на склад рэдакцыі. Ён настайваў, каб у ім поруч з інтэлігентамі былі абавязкова рабочыя. Павінна была-б таксама вельмі старэнна праводзіцца асобная палітыка гэтай газэты: яна павінна была быць ня вельмі выразна камуністычнай, але аддаваць вельмі вялікую і канкрэтную ўвагу рабочаму жыцьцю.

Ленін зрабіў на мяне вельмі глыбокае ўражаньне.

З таго спатканьня я зразумеў, што я таксама бальшавік і рашыў ісьці за гэтым вялікім таварышом, настаўнікам і правадыром.

Т. Бэлл.
(*Член прэзыдыуму Камінтэрну*)

Ленін застаўся нашым настаўнікам.

(Артыкул т. Клары Цэткін).

Мінула пяць год з таго часу, калі да міліёнаў пралетарыяў замное куці дайшла вестка: „Вялікага нама сярод нас. Ленін памёр".

Але ці самёр Ленін? Ці засталіся мужчыны рабочае клясы і сялянства, ці засталіся ўсе прыгнечаныя поўначы і поўдню, усходу і захаду бяз цьвёрдага і мудрага кіраўніцтва на іх шляху да вызваленьня ад ня волі?

Не і не! Памёршы Ленін жыве, як і раней. Гэніяльны дух яго ня можа пагаснуць; такое гарачае сэрца, як яго, ня можа астынуць. Яго магутная воля не магла отрацць сваёй моцы нават тады, калі фізычна ён спыніў сваё існаваньне.

Дух, сэрца і воля Леніна ўтварылі і на справе, і ў пісаньнях, і ў прамовах: камуністычную партыю Расеі, Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік і Камуністычны Інтэрнацыянал.

І Ленін застаўся нашым настаўнікам.

У ленінскіх словах і дзеяньнях шукае камуністычна-настроеная маса ўсіх краін растлумачэньня і кіраўніцтва па ўсіх паўстаючых перад ёй пытаньнях.

Зразумець ленінскае вучэньне, зрабіць яго сваім—вось задача працоўных і сьвядомых жанчын.

Калі нават Ленін не напісаў ніводнага радочку спэцыяльна па жаночаму пытаньню, ня выказаў публічна ніводнага слова непасрэдна па гэтаму пытаньню, усё-ж ён застаецца вяліканым правадыром, які вядзе жанчын да вызваленьня і ў вялікім вызваленчым руху жанчын праз пралетарскую рэвалюцыю ён зрабіў больш, чымся хто-небудзь на сьвеце.

Аб асновах сацыялізму Ленін не гаварыў у салёных багачоў. Ён распаўсюджваў свае вучэньне на фабрыках і заводах, у хатах-сялян. У пераможнай рэвалюцыйнай барацьбе, падтрыманай бяднейшым сялянствам, пралетарыят СССР заваяваў упяршыню ў сьвеце дзяржаўную ўладу і ўстанавіў савецкі ўрад над сваёй дыктатурай.

У Саюзе Савецкіх Рэспублік і дыктатуры пралетарыяту працоўныя жанчыны, упяршыню ад часу сівых вякоў, жывуць ва ўмовах права і раўнаправя.

У краінах Захаду расейская рэвалюцыя абудзіла прыгнечаных і зьняволеных. Жанчыны, грунтуючыся на сваім чалавечым праве, патрабуюць роўных з мужчынамі правоў, і вырываюцца з сваіх ланцугоў. Голас Леніна пачуўся ў буры і вольнасьці пралетарскае рэвалюцыі савецкіх краін, на ўсіх несавецкіх краінах мілёнамі працоўных жанчын.

Вызваленьне працоўных праз камунізм, які дае чалавечыя праны жанчынам, ня можа абмежавацца адной краінай. Ён павінен быць міжнародным; патрэбна ўсюды вырваць капіталізм, трэба зьнішчыць яго ў ўсім сьвеце нявольніцтва і ўрыгчэчыць чалавека чалавекам.

І вось на вымену другому Інтэрнацыяналу, які ашукваў і ягідна здрадзіў справе пралетарскае салідарнасьці, знаходзячыся на службе ў капіталу,—утварэнне пралетарскі Інтэрнацыянал рэвалюцыйнае барацьбы.

Ленін быў яго творцом.

Хочаце вы зубім вольным, акінуць ланцугі, [illegible] ваша пела і сьпяваюць вашу душу,—тады змагайцеся за зьнішчэньне прыватнае ўласнасьці, шукаці пралетарскае рэвалюцыі.

Вось напамінаньне, якое Ленін дае жанчынам.

Толькі камунізм можа вызваліць жанчын.

КРЫВАВАЯ НЯДЗЕЛЯ Ў ПЕЦЯРБУРЗЕ.

(9 СТУДЗЕНЯ 1905 ГОДУ).

Зьверская расправа царызму з рабочымі.

(УСПАМІНЫ ВАЧАВІДЦА).

Прыехаў я ў Пецярбург 6-га сьнежня 1904 г., пасьля скансэньня вайсковай службы. Хоць я і пазбаўлен быў права ўезду ў сталіцы, аднак, але як радзіле мае таварышы, прыехаў, разьлічваючы халайнічаць адмены забароны, карыстаючыся «вясной» Сьвятаполка-Мірскага.

Цэнтральны камітэт РСДРП быў у той час у руках меншавікоў, а Пецярбурскі камітэт у руках бальшавікоў. ЦК арганізаваў у процівагу Пецярбурскага К-ту раўнаежную яму арганізацыю пад назвай «Група ЦК». Так ен рабіў і ў іншых гарадох, дзе былі бальшавіцкія камітэты.

Настрой рабочых перад 9 студзеня быў вельмі напружаны. Вайна з Японіяй, якая вельмі затягнулася, не абяцала нічога добрага пецерскім рабочым. Агульных усерасейскіх мабілізацый у часе вайны з Японіяй ня было, а кожны раз па меры патрэбы праводзілі мабілізацыю то ў адным шэрагу губэрняў, то ў другім. У Пецярбурзе мабілізацыі пакуль яшчэ ня было, але вры заціяжці вайны і па меры вычэрпаньня запасаў гарматнага мяса чарга магла дайсьці і да Пецярбурга.

Рабочыя Пецярбургу гэта прадчувалі і зацягваньне вайны непакоіла іх тым больш што гэта авантурыстычная вайна была ў вышэйшай ступені непапулярна.

Адна з тавных легальных газэт (ня памятаю яе назвы) узяла на сябе як-бы місію адбіваць настрой рабочых, выяшчаючы карэспандэнцыі з фабрык і заводаў і артыкулы па рабочаму пытаньню. Газэта карысталася ў рабочых масах вялікай папулярнасьцю і шырока распаўсюджвалася. Асаблівую ўвагу рабочых прыцягвалі артыкулы нейкага «Строева». Гэта газэта адыграла буйную ролю ў справе арганізацыі грамадзкай думкі рабочай масы тагочасный сталіцы.

У той-жа час рабочыя мелі і легальную арганізацыю, якая называлася, калі ня мылюся, «таварыствам фабрычна-заводзкіх рабочых». Гэта арганізацыя была зубатаўская, у ёй праваў поп Гапон пад апекай дэпартаменту паліцыі. У момант 9-га студзеня «Т-ва» мела ў розных раёнах Пецярбургу, наколькі памятаю, 14 аддзяленьняў. Напружаны настрой рабочых стварэў вельмі моцную патрэбу ў шырокай, масавай арганізацыі і, ня маючы магчымасьці здаволіць гэту патрэбу мінуючы Гапонаўскае «Т-ва», рабочыя масамі кінуліся туды і ўнесьлі новы дух—свой рэвалюцыйны энтузіязм. Гэты антузіязм быў такі моцны, што «заразіў» сваім плывам і самога папа Гапона, зрабіўшы з яго „героя на гадзіну".

Настрой рабочых, урэшце, дасягнуў такога напружаньня, што павінен быў выліцца ў нешта выразнае. Патрэбен быў толькі які небудзь повад, які адыграў-бы ролю кроплі перапоўнішай кубак. Такі повад зьявіўся. Адміністрацыяй Путілаўскага заводу быў звольнен адзін з рабочых. Рабочыя патрабавалі прыняць яго назад. Адміністрацыя адмовіла. Патрабаваньне рабочых было падтрымана «Т-вам фабрычна-заводзкіх рабочых», але таксама не дало ніякіх вынікаў. Абураныя ўпартасьцю адміністрацыі заводу, прадстаўнікі «Т-ва» пішуць заяву граданачальніку з зазначэньнем, што калі іх патрабаваньне аб прыняцьці назад звольненага рабочага ня будзе здаволена, дык яны не адказваюць за спакой сталіцы. Гэта заява была падрукавана ў газэтах і, як кажуць, падзіла масла ў агонь.

Пачалася рэвалюцыя. Афіцыйна пачаткам рэвалюцыі лічаць 9-е студзеня, але гэта ня зусім так: рэвалюцыя пачалася некалькімі днямі раней. Ва ўсіх раёнах гораду пачалі спыняцца фабрыкі і заводы. Масы рабочых, вышаўшыя са спыненага заводу, накіроўваліся да бліжэйшага заводу ці фабрыкі, забіралі рабочых, якія далучаліся да іх, і разам накіроўваліся да трэцяга заводу і г. д., узрастаючы як лавіна, пакуль усе фабрыкі і заводы гэтага раёну ня спынілі працы.

Масы забаставаўшых па чарзе (па фабрыках і заводах) накіроўваліся ў памяшканьні аддзяленьняў гапонаўскага таварыства, дзе выступалі прамоўцы розных палітычных напрамкаў, аўдыторыя „палівалася" прамаўленьнямі, агалашалася і абмяркоўвалася вядомая «пэтыцыя» да цара, і рабочыя запрашаліся на 9-е студзеня ісьці да цара для падтрыманьня гэтае «пэтыцыі».

Варочаюся да падзей 9-га студзеня. Жыў я на Выбаргскай старане. Зборным пунктам было Выбаргскае аддзяленьне гапонаўсаага таварыства, адкуль нашая калёна накіравалася праз Самсоніеўскі мост у напрамку да Троіцкага маста. На Пецярбурскім баку да нас далучылася калёна гэтага раёну. Па ўсяму шляху руху на скрыжаваньнях вуліц сталі ўзмоцненыя нарады гарадзкіх, якія не дазвалялі ўхілянца нікому ў іншыя вуліцы і ўвесь рух накіроўвалі па аднаму логву туды, дзе для нас была падрыхтавана і пахота і коньніца.

Набліжаемся да Троіцкага маста. Подступы да яго заняты войскам, ад нас патрабуюць вярнуцца назад. Натоўп ня спыняе рухапца непарад. Чуюцца залпы, падаюць забітыя і параненыя. Натоўп спачатку прыпыніўся, потым уздрыгануў і кінуўся ўцякаць. Заставалася-б даволі, але не—царскім сабакам гэтага было мала.

Шалёным галопам кідаецца на ўцякаючых коньніца. Натоўп у жаху мятусіцца, шукаючы ратунку ў дварох, але двары аказаліся запёртымі (зразумела, па загаду зьвыш). Усё гэта паказвае, што мэта царскага ўраду была ня толькі ў тым, каб разагнаць дэманстрацыю, а, галоўным чынам, у тым, каб наладзіць магчыма большы крывапуск рабочых і тым іх палоўга „супакоіць". Ня глядзячы, аднак, на суровы загад, некаторыя дворнікі (вельмі нячногія), бачачы такія агідныя, адчынілі фіртачкі. Я памятаю, што ў той момант, калі коньніца ўжо гатова была мяне разам з іншымі таварышамі разтушыць, перад намі раптам адчыняецца фортка, куды мы і хаваемся. Малюнкі дэманстрацыі і бойні безаружных былі прыблізна аднолькавыя ва ўсіх раёнах, за выключэньнем Нарвскага раёну, дзе дэманстрацыя рухалася ва чале пана Гапона ў царкоўным убраньні і з харугвямі, што надавала працэсіі характар нібы крыжовага ходу. Аднак гэта ўсім не перашкодзіла войску растрэльваць рабочых.

У выніку зьверскае расправы з безаружнымі рабочымі загінула, як казалі, каля 4000 чал. Паліцыя грузіла забітых на фурманкі, як дровы, і накіроўвала на могілкі.

М.

9-е СТУДЗЕНЯ І ЛЕНІН.

Калі ў Піцеры адбыліся крывавыя падзеі 9 студзеня 1905 г., Уладзімір Ільліч быў заграніцай. Аднак, з сваёй далёкай высылкі ён з уласьцівай яму праніклівасьцю вельмі правільна вызначыў характар падзей і зрабіў з іх усе вывады, якія потым апраўдаліся цалкам і поўнасьцю.

Пазьней для шмат каго стала ясным, што студэнцкія падзеі былі пачаткам вялікага рэвалюцыйнага руху, але гэта была ацэнка рэтраспэктыўная, ацэнка, якая была зроблена ўжо тады, калі далейшы рост руху расчыніў вочы нават сьляпым. У першыя дні пасьля 9 студзеня шмат хто ў піцерскай рабочай дэманстрацыі бачыў толькі выступленьне ашуканых людзей, толькі „сьлязьніцу", зьвернутую за агідчага цара; рэвалюцыйнае значэньне „крывавай нядзелі" ня было дастаткова ацэнена.

Зусім інакш рэагаваў Уладзімір Ільліч на студэнцкія падзеі.

Ужо 18 студзеня 1905 году ён піша: „паваротны пункт у гісторыі Расеі надышоў... Расейскі рабочы рух за некалькі дзён узьняўся на вышэйшую ступень. На нашых вачох ён вырастае ў агульнанародне паўстаньне". («Вперад» № 4, ад 18 студзеня 1905 году).

Значэньне для Леніна студэнцкія дні—ня мірныя дэманстрацыя ашуканых рабочых, а пачатак рэвалюцыі.

„Рэвалюцыя пашырэнна"—заяўляе ён у тым-жа артыкуле і тут-жа дае бліскучы прагноз (прадказаньне) далейшага ходу падзеяў.

З уласьцівым яму рэалізмам Уладзімір Ільліч ня утойвае ні ад сябе, ні ад другіх усіх цяжкасьцей, якія знаходзяцца на шляху развіцьця рэвалюцыйнага руху ў Расеі. Ён ведае, што паражэньні немінучы, але ён глыбока перакананы, што за часовым паражэньнем немінучы рэвалюцыйны ўздым.

Для яго студэнцкі рух толькі першая ступень. „Як-бы ні скончылася сучаснае паўстаньне ў самым Пецярбурзе,—піша ён, у тым-жа нумары сваёй газэты „Вперад",—у кожным разе яно няўхільна і немінуча зробіцца першай ступенью да яшчэ больш шырокага, больш сьвядомага, больш падрыхтаванага паўстаньня. Ураду можа быць удасца адкласьці гадзіну расплаты, але адклад толькі зробіць больш грандыёзным наступны крок рэвалюцыйнага націску".

Трэба ўспомніць, што гэта было напісана праз дзевяць дзён пасьля студэнцкіх падзей, каб ацаніць праворлівасьць вялікага правадыра.

Тады-ж ацэньваючы значэньне «крывавае нядзелі», Ленін намячае асноўныя рухаючыя сілы будучае рэвалюцыі—пралетарыят і сялянства. У процівагу меншавікам, надаючым вялізнае значэньне рэвалюцыйнасьці лібэральнае буржуазіі і інтэлігенцыі (бо рэвалюцыя была «буржуазнай»), Ленін высоўвае на першы плян пралетарыят і сялянства. Ён піша („Вперад" 18 га студзеня 1905 г.): „Пралетарыят будзе далучацца да барацьбы, пакідаючы фабрыкі і заводы (тут прадказана Кастрычніцкая забастоўка), рыхтуючы сабе ўзброеньне.

Як вядома, адным з важнейшых лёзунгаў бальшавізму зьяўляецца неабходнасьць узброенага паўстаньня, як выражаючага лёс рэвалюцыі; гэтым бальшавізм адрозьніваўся (яшчэ больш адрозьніваецца зараз) ад меншавізму, які праповедуе мірную канстытуцыйную барацьбу (успомнім нашых ліквідатараў)

Ужо ў студзені, зараз-жа пасьля піцерскіх падзей, Уладзімір Ільліч высоўвае гэты лёзунг, як практычную задачу. «Неабходнае ўзброеньне рабочых і ўсіх грамадзян наогул,—піша ён,—падрыхтоўка да арганізацыі рэвалюцыйных сіл для зьнішчэньня урадавае ўлады і ўстаноў—вось тая практычная аснова, на якую могуць і павінны злучыцца для агульнага ўдару ўсе і розныя рэвалюцыянэры".

Як 1905 так і 1917 годы, пацьвердзілі цалком і поўнасьцю пункт гледжаньня Леніна: бяз узброенага паўстаньня няма рэвалюцыі.

Нарэшце, тады-ж у вядомыя студэнцкія дні Уладзімір Ільліч улічыў і адзначыў міжнароднае значэньне расейскае рэвалюцыі.

«На пралетарыят усяе Расеі глядзіць цяпер напружанай нецярпеливасьцю пралетарыят усяго сьвету. Нізрынуцьце царызму ў Расеі... будзе паваротным пунктам у гісторыі ўсіх краёў, палягчэньнем справы ўсіх нацый, усіх дзяржаў... І ніхай кожны сапыял-дэмакрат, ніхай кожны сьвядомы рабочы памятае аб тым, якія вялікія задачы ўсенароднае барацьбы ўскладзены на яго плечы» («Вперад» 18-га студзеня 1905 г.).

Падзеі зноў-такі поўнасьцю пацьвердзілі гэту ацэнку.

Нават вялікая рэвалюцыя 1905 г. знайшла жывы водгук у шэрагу краін (Турцыя, Пэрсія, і інш.); рэвалюцыя-ж 1917 г. гучным рахам адбілася па ўсёй Эўропе, зьмятаючы сьпежкі, руйнуючы „стары нарадак", абудзіла сьпячую Азію, абудзіла прадоўная масы Эгіпту, Індыі, Кітаю, Пэрсіі, Турцыі...

Вялікім дарам праворлівасьці ўладаў наш правадыр Ён бачыў у «крывавай нядзелі» не далёкую зарніцу, а блізкую навальніцу і буру.

Д. Г.

Польшча рыхтуе напад на Савецкую Украіну.

НОВАЕ ПАДАРОЖЖА ГЕНЭРАЛА ЛЕРОНА У ВАРШАВУ.

Выкрываньні у нямецкай газэце „Таг".

БЭРЛІН, 18-1. Бухарэсцкі карэспандэнт «Таг» паведамляе пра новае падарожжа генэрала Лерона ў Варшаву, у зьвязку з падрыхтоўкамі, якія праводзяцца ў Польшчы з вялікай энэргіяй да „гвалтоўнага вырашэньня ўкраінскага пытаньня ў польскім духу". Водлуг слоў карэспандэнта, у Польшчы арганізаваны кадры для 6 украінскіх дывізій пад начальствам генэралаў Бязручкі, Сальскага і Аседы. Поруч з перамовамі і ваеннымі падрыхтоўкамі, якія адбываюцца ў Варшаве, «некаторыя асобы» абмяркоўваюць пытаньне, у якой меры Румынія і Чэхаславакія могуць быць прыцягнуты да намечанага польска-румынскага выступленьня, якое чакаецца сёлета ўвесну; пры гэтым зазначаюць, што трэба зьнішчыць нездаволеньне, якое выклікаюць у Румыніі польска-вэнгерскія перамовы.

Далей карэспандэнт паведамляе, што ў Варшаве надаюць сур'ёзнае значэньне пытаньню наконт пазіцыі, якую зойме Чэхаславакія; гэта, між іншым, зьвязана з намерам адначасна з украінскім пытаньнем разьвязаць таксама ў „польскім духу" і літоўскае пытаньне, а гэта, як відаць, павінна выклікаць канфлікт з Нямеччынаю. У асьвядомленых варшаўскіх колах, водлуг слоў карэспандэнта, добра вядома, што блізкія да Пілсудзкага асобы настроены зусім ня проці канфлікту з Нямеччынаю, бо галоўнаю мэтаю замежнае палітыкі Польшчы зьяўляецца заўладаньне Усходняй Прусіяй. Вельмі адказныя варшаўскія палітыкі лічаць, што ў адносінах да гэтае мэты захоп Літвы павінен адыгрываць падначаленую ролю; справа можа набыць такі напрамак, што Літва можа зьявіцца пазьней пры мірных перамовах «прадметам кампэнсацыі».

Зьмяшчаючы гэтае паведамленьне свайго карэспандэнта, «Таг» зазначае, што генэралу Лерону даручана падрыхтаваць выступленьне усходніх вассалаў Антанты проці СССР. Газэта заяўляе таксама: „Ва ўсякім разе гэтыя ваенныя падрыхтаваньні поўнасьцю выкрываюць польскія манэўры з зацягваньнем адказу на савецкую прапанову аб наданьні правамоцнасьці пакту Келёга".

Інаятула пакінуў Аўганістан.

КАБУЛ, 18-1. Інаятула вылецеў у Індыю на ангельскім самалёце разам са сваёю сям'ёю. Дзеля гэтага сёньня прыляцелі з Пэшавару (Індыя) 2 ангельскіх самалёты, выкліканыя ангельскай місіяй па просьбе паўстанцкага камандаваньня. Недатыкальнасьць Інаятулы і яго сям'і з моманту выхаду з Арку (рэзыдэнцыя падышаха) да пасадкі ў самалёт была гарантавана ангельскай місіяй. Заўтра павінны прыляцець 2 ангельскіх самалёты, каб вывезьці ў Індыю іншых членаў ранейшага каралеўскага дому.

Інятула мяркуе з Пэшавару накіравацца ў Кандагар.

ПА ЎКАЗЦЫ З ПАРЫЖУ.

У РУМЫНІІ ЎЖО ІНШЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПРАПАНОВЫ СССР.

ВЕНА, 18-І. З Бухарэсту паведамляюць, што ў процівагу ранейшым тлумачэньням, пасьля прамовы міністра замежных спраў Міранэску, увесь румынскі буржуазны друк, як відаць у выніку афіцыёзнае інструкцыі, аднадушна выказваецца проці савецкае прапановы. Адначасна друк вітае ратыфікацыю пакту Келёга сэнатам Злучаных Штатаў і выказвае на зею, што пакт Келёга хутка набудзе моц, у зьвязку з чым савецкая прапанова, водлуг думкі друку, аднадзе.

Канфлікт у саарскай горнапромысловасьці.

БЭРЛІН, 16-І. У адказ на ўвядзеньне францускай адміністрацыяй новага тарыфу, гарнікі Саарскае вобласьці парашылі абмежаваць здобычам вугалю ў разьмеры, які забясьпечвае мінімум заработнае платы. Гэтая пастанова правозьвіцца ў жыцьцё пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнае прафсаюзнае меншасьці амаль ва ўсіх каменна вугольных капальнях, дзякуючы чаму здобыч вугалю ў Саарскай вобласьці зьменшыўся амаль на 40 проц.

КАМПАРТЫЯ—АДДАНЫ ПРАВАДЫР БЕСПРАЦОЎНЫХ.

БЭРЛІН, 18-І. Рух беспрацоўных пад кіраўніцтвам кампартыі распаўсюджваецца паступова на ўсю Нямеччыну. У Лейпцызе адбыўся масавы мітынг беспрацоўных з дэманстрацыяй, якая была разагнана паліцыяй пры дапамозе гумовых кіёў.

Працоўныя Бэсарабіі ў абоймах голаду і гвалтаў.

ВОСЬ ВЫНІК 11-ГАДОВАГА ГАСПАДАРНІЧАНЬНЯ РУМЫНІІ Ў АКУПАВАНЫМ КРАЇ.

МАСКВА, 18-І. Цэнтральны савет таварыства бэсарабцаў зьвярнуўся да рэвалюцыйных рабочых і сялян усіх краёў з адозвою, у якой, між іншым, зазначана:

Мінула 10 гадоў з часу Хоцінскага паўстаньня, 10 гадоў назад працоўнае жыхарства савецкае Бэсарабіі даведзенае да роспачы суровасьцямі захапіўшае край ваеннічыны памешчыцкае Румыніі, узялося за зброю і выгнала акупантаў з усяго Хоцінскага і часткі Сароцкага паветаў. Аднак, дрэнна ўзброеныя, слаба арганізаваныя паўстанцы ня мелі сілы змагацца проці контр наступу кінутае проці іх рэгулярнае румынскае арміі. Пасьля адступленьня паўстанцаў-партызанаў поле Паўночнае Бэсарабіі было ўслана 11-цю тысячамі трупаў 50 тысяч сялян з сем'ямі ўцякло за Днестр на Украіну і ў Галіцыю.

З 10-мі ўгодкамі паўстаньня супадаюць 11-я ўгодкі крывавае румынскае акупацыі Бэсарабіі. Сёньня палова Бэсарабіі, ня менш як паўтары мілёны яе жыхароў, востра і безнадзейна галпдуе. Сапраўдная прычына голаду і зруйнаваньня ляжыць у акупацыі Бэсарабіі, у румынскай сыстэме гаспадарнічаньня, падняволеньня сялян і рабочых. Дапамажэце мілёнам працоўных Бэсарабіі, якіх румынская акупацыя аддае на голад і вымираньне. Ім патрэбна неадкладная дапамога грашыма і хлебам".

ПУАНКАРЭ ЗАТАПЛЯЕ Ў КРЫВІ ГАРНЯЦКУЮ СТАЧКУ

«РАЗУМНАЯ ТАКТЫКА» РЭФАРМІСТАЎ ПАСПРЫЯЛА НЯЎДАЧЫ СТАЧКІ Ў РАЙЁНЕ ЛУАРЫ.

ПАРЫЖ, 18-І. У басейнах Гар і Аэйрон пачаўшаяся стачкі між бастуючымі горнарабочымі і жандармэрыяй. У большасьці падставамі для стачкі зьяўляюцца захады жандармэрыі проці стачачных пікетаў, якія не пушчаюць штрайкбрэхераў на працу. Сурёзныя стачкі адарыліся учора ў Трыкоці, дзе група бастуючых, у ліку блізка 200 капальнікаў спрабавала выкаліць арыштаванага жандарамі таварыша. Пры гэтай стачцы жанд ры, як паведамляе „Юманіта", цяжка паранілі 5 і дзёгка—10 капальнікаў.

Не зважаючы на ўсе захады прадпрыймцаў, а таксама на ўсе патугі рэфармістаў, лік бастуючых у басейне Аэйрон павялічваецца. У барацьбе проці забастоўкі робяцца спробы ўплыву на рабочых-чужаземцаў, якім пагражаюць высылкаю.

У басейне Луары забастоўка горнарабочых скончылася. З ліку баставаўшых прадпрыёмцы звольнілі блізка 150-ці капальнікаў. 7 капальнікаў аддаецца пад суд; яны абвінавачаны ў „парушэньні волі працы» (г. зн. у барацьбе проці штрайкбрэхерства).

Падрыхтоўваючы выніні забастоўкі ў раёне Луары, орган прамысловых колаў «Журнэ Эндустрыэль» піша, што галоўнымі прычынамі няўдачы забастоўкі ў гэтым раёне зьяўляюцца, папершае, «паступовае адмова вугляпрам адпускаў ад перамоў з унітарнымі прафсаюзамі", а падругое—«разумная тактыка рэфармістаў, якія, разумеці, што забастоўка накіравана перш на-перш проці іх уплыву на капальніцкія масы".

НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У СІРЫІ ШЫРЫЦЦА.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 18-І. «Мілієт» паведамляе, што непакоі ў Сірыі ня спыняюцца. Гэтымі днямі дэманстранты-нацыяналісты разграмілі рэдакцыі трох газэт, якія фінансуюцца францускаю ўладаю, за артыкулы проці сірыйскага нацыянальнага руху. Як відаць, француская ўлада лічыць становішча ў Сірыі вельмі напружаным, бо ўмацоўваецца Дамаск і ваколічныя райёны.

Гадавіна савецка-латвійскага ўгавору.

РЫГА, 18-І. Адбыўся сход саюзу рыскіх фабрыкантаў з удзелам дырэктара гаспадарчага дэпартаменту міністэрства фінансаў Мэйса, прысьвечаны вынікам першага году прамысловасьці савецка-латвійскага ўгавору. «Сход прызнаў,—заявачана ў афіцыйным паведамленьні, агалошаным у друку,—што ўгавор значна спрыяў уздыму латвійскае прамысловасьці і ганлю ўжо на працягу першага году. Угавор абярнуўся ў значны фактар гаспадарчага жыцьця Латвіі і павінен быць усімі прызнаны такім».

У СССР.

Вышаў 4-ты том „Ленініяды".

МАСКВА. Інстытут Леніна пры ЦК УсеКП(б) выпусьціў у сьвет 4-ы том „Ленініяды"—выданьне, якое ставіць сваёй мэтаю даваць штогоднія сыстэматычныя агляды ўсяе літаратуры, прысьвечанай Леніну і ленінізму. Гэты том дае агляд літаратуры за 1927 год і ахапляе блізка 3-х тысяч назваў кніг, часопісных і газэтных артыкулаў. Тут вычэрпваюча сабраны таксама ўсе зьмешчаныя на старонках перыядычнага друку рэцэнзіі і водгукі на ленінскую літаратуру.

З тэарэтычных і практычных праблем ленінізму асабліва высьветлены тыя пытаньні, якія стаялі на парадку дню ў перыяд барацьбы з апазіцыяй: магчымасьці пабудаваць сацыялізм у адным краі, барацьба з нэп меншавізмам, пытаньні індустрыялізацыі, роля дзяржаўнае прамысловасьці і канцэсіі, палітыка партыі на вёсцы, роля саветаў у мітайскай рэвалюцыі і г. д.

Забясьпечым весчавы засеў інвэнтаром.

Нарада пры ЦК УсеКП(б) аб веснавой засеўнай кампаніі.

МАСКВА. Гэтымі днямі ў аддзеле ЦК УсеКП(б) па працы на вёсцы адбылася нарада аб пытаньнях веснавое засеўнае кампаніі. Прадстаўнікі ведамстваў, устаноў і арганізацый інфармавалі аб ходзе падрыхтоўчае працы да веснавога засеву і аб мерапрыёмствах, якія спрыяюць пашырэньню засеўнага абшару.

Нарада адзначыла, што недасеў у мінулую азімінную кампанію і скарачэньне абшару перашкаджаюць выканаць дырэктывы аб пашырэньні засеўнага абшару мінімум на 7 проц. Нарада лічыць, што для посьпеху засеўнае кампаніі, трэба прывесьці ў рух увесь нізавы савецкі апарат і ўскласьці на яго адказнасьць за правядзеньне намечаных мерапрыёмстваў.

Нарада адзначыла вялікую зношанасьць сельсна-гаспадарчага інвэнтару. Прамысловасьць павінна павялічыць выраб патрэбных прылад для сельсна-гаспадарчага інвэнтару. Адначасна нарада ўхвалила зьвярнуць увагу ВСНГ на тое, што Варонескі завод да гэтага часу на здаў ніводнага трэеру гандлюючым арганізацыям. Для таго, каб сялянства пашырыла засеўны абшар, трэба НЕ ПАЗЬНЕЙ ПАЛОВЫ ЛЮТАГА АГАЛАСІЦЬ ПАПРАЎКІ ДА ЗАКОНУ АБ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ. Наркамзему д ручана разам з НК Гандлю і саветам с.-г. канцэсіі распрацаваць пытаньне НАКОНТ ЗАСНАВАНЬНЯ СПЭЦЫЯЛЬНЫХ НАТУРАЛЬНЫХ ХЛЕБНЫХ ФОНДАЎ У СЫСТЭМЕ С.-Г. КААПЭРАЦЫІ ДЛЯ АБМЕНУ НА ВЫСОКАГАТУН ОВАЕ НАСЕНЬНЕ, ЯКОЕ МАЮЦЬ СЯЛЯНСКІЯ ГАСПАДАРКІ

Нарада прызнала, нарэшце, патрэбным МАБІЛІЗАВАЦЬ НА ВЁСКУ для правядзеньня веснавое засеўнае кампаніі студэнтаў апошніх курсаў сельсна-гаспадарчых, а таксама іншых вышэйшых навучальных устаноў. Наркамземы і канцэсірацыйныя цэнтры павінны правесьці мабілізацыю працаўнікоў для правядзеньня веснавое засеўнае кампаніі.

Завочныя курсы марксызму.

МАСКВА. АППА ЦК УсеКП(б) засноўвае у Маскве пры курсах актыву Камуністычнае Акадэміі завочныя курсы марксызму. Кантынгент курсаў устаноўлен для першага году у 150 чалавек. Асноўным мэтадам завочных курсаў будзе завочная праца, а заключным этапам — паўтарамесячныя канфэрэнцыі ў Маскве. На пэрыяд гэтых канфэрэнцый завочнікам будуць дадзены інтэрнат, харч, літаратура і інш. Заняткі на завочных курсах марксызму распачнуцца 15 лютага.

Дзярж. страхаваньне жыцьця сельскіх працаўнікоў у УССР.

ХАРКАЎ, 18-І. У зьвязку з пачашчанымі выпадкамі кулацкае расправы з вясковымі грамадзкімі прапаўнікамі, старшыня СНК Украіны даручыў падрыхтоўчай камісіі распрацаваць праект закону аб абавязковым асабовым страхаваньні за кошт дзяржавы усіх актыўных сельскіх працаўнікоў. Страхавую суму атрымае або сам сельскі працаўнік, які страціў працаздольнасьць у выніку кулацкае расправы, або ў выпадку яго сьмерці—яго сям'я.

ЛЕНІН АБ БАРАЦЬБЕ З УХІЛАМІ.

(АРТЫКУЛ ДЫРЭКТАРА ІНСТЫТУТУ ЛЕНІНА ТАВ. М. САВЕЛЬЕВА).

Ленін зьяўляецца ня толькі вялізарным тэарэтыкам і правадыром сусьветнае пралетарскае рэвалюцыі, але на працягу ўсёй гісторыі нашае бальшавіцкае партыі ён застаецца жывым увасабленьнем сапраўды пралетарскае непрымірымасьці ў барацьбе за чыстату клясавае лініі партыі. Ленін, найбольш глыбокі тэарэтык бальшавізму, зьяўляецца ў той-жа самы час геніяльным практыкам-стратэгам, будаўнікам нашае партыі. Ён нясупынна складае ў выключна цяжкіх абставінах партыю «по камешку» і нясупынна змагаецца на працягу звыш 20 год з розными праявамі апартунізму і ўхіламі ў яе шэрагах.

Зьвернемся да вытокаў зараджэньня партыі, да пэрыяду „Іскры".

Сярод рэдакцыі ідзе першая падрыхтоўка да другога зьезду партыі, які паклаў пачатак бальшавізму. Ленін у выдадзенай ім вядомай брашуры «Что делать?» наступным чынам красамоўна фармулюе задачы партыйнага аб'яднаньня: „Мы ідзём шчыльнай купкай па стромкаму і цяжкаму шляху, моцна узяўшыся за рукі. Мы абкружаны з усіх бакоў ворагамі і нам прыходзіцца заўсёды ісьці пад іх агнём. Мы злучыліся па вольна прынятай пастанове, іменна для таго, каб змагацца з ворагамі, а не адступаць у суседняе балота, жыхары якога з самага пачатку ганьбілі нас, што мы выдзяліліся ў асобную купку і выбралі шлях барацьбы, а ня шлях прымірэньня».

Так малюецца Леніну гэты цярністы шлях, патрабуючы адзінства волі, адзінства дзеяньня. «Пакіньце нас, не хапайцеся за нас і ня пэцкайце вялікага слова «свабода»—піша Ленін далей, у адносінах да усіх няўдачэўных і прапануючых: „пойдзем у гэтае балота».

Такім чынам, ужо ў 1902 годзе Ленін ставіў катэгарычна пытаньне аб адзінстве нашых шэрагаў, аб «маналітнасьці» партыі і яе кіруючага ядра, і з усёй рашучасьцю падкрэсьліваў, што ў партыі ня месца апартунізму, паколькі мы—большасьць партыі—«таксама «вольны» ісьці, куды мы хочам, вольны змагацца ня толькі з балотам, але і з тымі, хто паварачваецца да балота».

У гэтых некалькіх словах, напісаных звыш чвэрткі веку таму назад, у сутнасьці ўжо дзецца ўся асноўная ўстаноўка бальшавізму ў барацьбе з ухіламі, абгрунтоўваецца непрымірымая барацьба з хістаньнямі.

Пачынаючы з вышэйпамянёнага пэрыяду, нашая партыя паступова вырастае ў бязупыннай барацьбе з апартунізмам і рознымі ўхіламі ў магутную сілу. Яе шлях—гэта шлях суровае клясавае барацьбы, шлях перамогі супярэчнасьцей таксама і ўнутры самае сябе. Правільна фармулюе гэтае палажэньне т. Сталін, зазначаючы: „Калі ўзяць гісторыю нашае партыі з моманту яе зараджэньня ў выглядзе групы бальшавікоў 1903 г. і прасачыць яе наступныя этапы аж да нашага часу, дык можна сказаць без перабольшаньня, што гісторыя нашае партыі ёсьць гісторыя барацьбы супярэчнасьцей унутры гэтае партыі, гісторыя перамогі гэтых супярэчнасьцей і паступовага ўмацаваньня нашае партыі на аснове перамогі гэтых супярэчнасьцей». («Аб сацыял-дэмакратычным уліве у нашай партыі», даклад на VII пленуме выканкому Камінтэрну).

Якія-ж галоўныя этапы у барацьбе з асноўнымі супярэчнасьцямі перажывае партыя і з кім, з якімі плынямі і фракцыямі яна змагаецца за чыстату сваіх клясавых пазіцый? Нарэшце, супроць якіх ухілаў і хістаньняў асабліва папераджае яе Уладзімір Ільліч?

У пэрыяд старой «Іскры» Ленін вядзе рашучую барацьбу направа в гэтак званым эканамізмам і гуртковшчынай, тралюючы і выкрываючы апартуністычную сутнасьць рабочадзельчаства, яго хвасьцішчя прынцыпы, роўналежна адбіваючы ўдары заходня-эўрапейскіх бэрнштэйніянцаў і расейскіх легальных марксыста ў.

Групуючы навакол „Іскры" най больш вытрыманыя элемэнты тагочасных сацыял-дэмакратаў, ён вядзе згуртаваньне рэвалюцыйных элемэнтаў партыі ня толькі супроць бундыстаў, рабочадзельцаў, якія зьяўляюцца больш сур'ёзнымі ворагамі, але і розных груп і плыняў, якія спрабуюць цягнуць партыю назад ад выразнае пастаноўкі цэнтралізацыі сіл і сродкаў партыі, як гэта ставіць «Іскра».

Пасьля другога зьезду і утварэньня меншавізму, які зьяўляецца водлуг слоў Леніна, прапягам «эканамізму» у новых умовах, усе сілы яго палітычнага таленту канцэнтруюцца на выкрываньні апартуністычнае сутнасьці меншавіцкага крыла партыі, якое, на чале з Мартавым, Аксэльродам, Троцкім і інш., спрабуе апуляваць толькі што ўхваленыя пастановы другога зьезду і ня грэбуюць ніякімі сродкамі для ажыцьцяўленьня пастаўленых сабе мэтаў.

Скліканьне трэцяга тэрміновага зьезду, як мэтад выйсьці з утворанага меншавікамі партыйнага развалу, патрабуе ад Уладзіміра Ільліча рашучае барацьбы ня толькі па лініі меншавізму, які паступова выдзяляецца ў асобную партыйную арганізацыю, але і па лініі ўзьнікшае пасьля другога зьезду супярэчнасьці прымірэнчае плыні сярод самага бальшавізму.

Кіраўнік тагочасных прымірэнцаў Наскоў, які быў на другім зьезьдзе цьвёрдым бальшавіком і абраны па сьпісу большасьці ў ЦК, вельмі хутка аб'яднае навакол сябе невялікую групу бальшавікоў-прымірэнцаў, захапляючы ў свае рукі ЦК, ідучы на згоду з меншавікамі, даючы ім магчымасьць фактычнага гаспадараньня ў партыі, Наскоў і яго прыхільнікі вельмі аб'застраюць барацьбу Леніна за будаўніцтва партыі, за зьнішчэньне пэрыяду разброду і саматужніцтва.

У адным з лістоў да Наскова Ленін піша яму адносна яго пазіцыі, прадыктаванай, водлуг заявяраньню самога Наскова, нібы жаданьнем «міру» ў партыі:

«Пытанье, у якім-жа сэнсе можна цяпер гаварыць аб міры? Калі разумець пад мірам ачышчэньне ідэйнае барацьбы ад каптыльнае дразгі, дык я і зараз зусім гатоў згадзіцца на мір і аднавіць зробленую ў саветах прапанову. Калі-ж разумець пад мірам спыненьне ідэйнае барацьбы, прымірэньне з напрамкам „Іскры", дык такі мір могуць ці апанаваць толькі людзі беспрынцыповыя, ці ня нчырыя...»

Так рашуча і востра ставіў Ул. І пытаньне аб барацьбе з беспрынцыповым згодніцтвам, спрабаваўшым завесьці партыю ў балота апартунізму, зьнішчыць пастановы другога зьезду партыі.

Патрабавалася ўтварэньне Бюро Камітэтаў Большасьці, аб'яднаўшага значную большасьць мясцовых арганізацый, каб наперакор прымірэнчаству і спробам меншавікоў, усё-ж склікаць тэрміновы III зьезд партыі і рашуча пакласьці канец прымірэнчым хістаньням.

Высуноўшы ў якасьці асноўных лёзунгаў у 1905 годзе барацьбу за «дыктатуру пралетарыяту і сялянства» і падрыхтоўку ўзброенага паўстаньня, партыя бальшавікоў на чале з Леніным вядзе энэргічную барацьбу з апартуністычнай тактыкай меншавізму і яго маскіроўкай у выглядзе трацкізму, які спрабаваў нібы «зьлева» (тэорыя парманэнтнай рэвалюцыі) крытыкаваць Леніна.

Асабліва шмат навучальнага для ўяўленьня левінскае стратэгіі і тактыкі дае пэрыяд рэакцыі, якая пачалася пасьля паражэньня 1905-1907 г. і цягнулася да пачатку новага ўздыму перад імпэрыялістычнай вайной 1914 г. «Гэта быў крытычны пэрыяд у жыцьці вашае партыі» —гаворыць т. Сталін—«гэта быў той пэрыяд, калі шэраг бальшавікоў з старой гвардыі пакінулі Леніна

Наша гаспадарка і культура—на ленінскім шляху.

Нацыянальнае і культурнае пытаньне вырашаем па-ленінску.

Нацпытаньне ў Магілеўшчыне.

(Ад нашага карэспандэнта).

Нацыянальны склад насельніцтва акругі досыць разнастайны; па перапісу 1926 году насельніцтва акругі ў агульным складзе: беларусы—90.77 пр., яўрэі—5,91 пр., расейцы—1.92 пр., палякі—9,76 пр., латышы 0,29 пр. і ў незначнай колькасьці—украінцы, літоўцы, татары, немцы і інш.

Такая стракатасьць нацыянальнага складу насельніцтва і вяўнасьць на установах акругі нават да гэтага часу «служылага люду», застаўшагася на тэрыторыі акругі ад царскага апарату—стварылі асаблівыя цяжкасьці для партыйных і савецкіх органаў у справе вырашэньня нацыянальнага пытаньня: „былыя людзі" вельмі хуга ўспрымалі беларусізацыю,

Вырашэньне нацыянальнага пытаньня ў асноўным адбывалася па лініі расслушчэньня асноў нацпалітыкі, па лініі абслугоўваньня нацыянальных меншасьцяў, беларусізацыі і карэнізацыі апарату.

Гэты год можна лічыць пераломным годам на Магілеўшчыне ў адносінах да беларусізацыі.

У паказаным годзе школы і навучальныя установы, абслугоўваючыя беларускае насельніцтва, ужо набылі выгляд беларускіх і сталі на цьверды шлях правядзеньня і ўзмацненьня беларускае культуры. Наогул, беларусізацыю школ ужо можна лічыць скончанай.

Слабей крыху праходзіла беларусізацыя палітасьветных устаноў (асабліва клюбаў і хат-чытальняў), што ў значнай меры было зьвязана з недахопам беларускіх кніжак.

Савецка-гаспадарчы апарат таксама працуе ўжо ў большасьці на беларускай мове.

Такім чынам, мерапрыёмствы па абслугоўваньню на роднай мове асноўнай масы насельніцтва на яго роднай мове маюць амаль поўнае ажыцьцяўленьне.

Выбарчы склад саветаў і выканкомаў, прафорганаў і інш. забясьпечаны прадстаўнікамі ўсіх нацыянальнасьцяў адпаведна нацыянальнаму складу насельніцтва.

У акрузе арганізаваны нацсаветы: два яўрэйскіх (Крычанскі) і Сялецкі) 1 польскі (Хрыпялеўскі) і 2 латыскіх (Грудзінаўскі і Галіцка-Мысскі) і два нацыянальных суды (яўрэйскі і польскі). У часе праходзячай перавыбарчай кампаніі будзе яшчэ арганізаваны адзін польскі нацыянальны савет у Бялынічкім раёне.

Правядзеньне нацыянальнае палітыкі не абмяжоўвалася толькі пралетаўленьнем магчымасьцяў культурнага разьвіцьця нацыянальнасьцяў. Партыйнымі і савецкімі органамі акругі вялікая ўвага надаецца падвядзеньню эканамічнае базы к вырашэньню нацыянальнага пытаньня.

Праведзена вялікая работа на надзяленьню працоўных яўрэяў зямлёю. Усяго перададзена ў працоўнае карыстаньне яўрэям каля 4000 дз. зямлі, на якой арганізавана 33 калгасы і 5 насёлкаў.

А. Д.

Магілеў.

Культбудаўніцтва акругі расьце.

(Ліст ад нашага мазырскага карэспандэнта).

Агульны культурны ўздым адпаведна адбіўся на ўзросьце культурных запатрабаваньняў шырокіх колаў рабочых і сялян, імкненьне якіх да навучаньня выявілася на толькі ў справе насылкі дзяцей у школу, але ў значнай меры і ў галіне адукацыі дарослых у вечарніх школах і школах па ліквідацыі нягаматнасьці.

Сетка 4-хгадовых і іншых школ з году ў год расьце. Калі ў 26-27 навучальным годзе мы па нашай акрузе мелі 4-х кампл. школ 6, 3-х кампл. 6, 2-х кампл. 81, дык у 27-28 г. мы ўжо мелі 4-хкампл. школ 7, 3-х кампл. 9, 2-хкампл. 108.

Такім чынам, агульны лік камплектаў узрос на 13·5 проц. Аднакамплектных школ адчынена 26, што складае 36 проц. ад агульнага ліку адчыняемых камплектаў. На школьнае будаўніцтва было адпушчана 121761 руб., з якіх на новае будаўніцтва 62000 р., па са абкладаньню насельніцтва на школьнае будаўніцтва сабрана 90075 рублёў.

Для павышэньня кваліфікацыі настаўнікаў былі праведзены акруговыя масьцітыдневыя настаўніцкія курсы, праз якія прапушчана 60 настаўнікаў і 18 вольных слухачоў.

У 1928-29 годзе па плану ўсеагульнага навучаньня неабходна было адчыніць 69 камплектаў, фактычна-ж школьная сетка чатырох гадовых школ вашырылася на 34 камплекты, што складае толькі 49 проц. усеагульнага навучаньня на 1928-29 г.

Адчыненьне 34 камплектаў разьмяркоўваецца наступным чынам: белар. 19, яўрэўск. 2, польскіх 4, украінскіх 1 і г. д. Усяго ў сямігодках акругі ў 1926-27 г. навучалася 5234 ч., а ў 1927-28 г. навучалася 5511 вучняў. У нашай акрузе існавала адна школа сялянскай моладзі ў Каралінскім раёне, у якой навучалася 92 вучні.

Надаючы вялізарнае значэньне падрыхтоўцы школаю сялянскай моладзі культурных вясковых гаспадароў і будаўнікоў калектыўных гаспадарак на 1928-29 вуч. год, рэарганізавана ў школу сялянскай моладзі Дамананвіцкая школа.

Мы маем у горадзе адзін педагагічны тэхнікум, і адну прафшколу дрэваапрацоўнікаў. У пэдтэхнікуме цяпер займаецца 225 чалавек. Прафшкола дрэваапрацоўнікаў існуе ў Мазыры з 1923 году.

Школа добра абсталявана, частка вытворчасьці ў ёй камунізавана. У 1927-28 навучальным годзе школа выпусьціла 20 чалавек, што складае 24,5 проц. ад агульнага ліку вучняў. У гэтым навучальным годзе, прафшкола рэарганізавана на базе сямігодкі.

У 1927-28 навуч. годзе ў Жыткавіцкім раёне адчынена прафшкола рыбаводства, у якой займалася 30 чалавек, цяпер школа мае ўжо 2 клясы, забясьпечана новымі выкладчыкамі і прыладамі.

Сетка палітасьветных устаноў за 1927-28 г. павялічылася. Калі ў 1926-27 г. мы мелі 26 хат-чытален, 31 чырв. куткоў, 3 вяч. школ рабоч. моладзі, 3 кіно-перасовак, дык у 1927-28 годзе мы мелі: хат-чытален 31, чырв. куткоў 67, вячэрн. школ раб. моладзі 5, кіно-перасоўкі і г. д.

Саф'ян.

Ажыцьцяўляем ленінскі плян кааперараваньня вёскі.

На сацыялістычным шляху.

(Старобінскі раён, Бабруйскай акругі).

У Старобінскім раёне 1928 г. з'яўляецца пераломным годам у працы савецкай улады, камуністычнай партыі па перабудове дробнай, сялянскай гаспадаркі на новыя, калектыўныя, буйныя формы.

У 1927 годзе праца па арганізацыі калектываў вялася кепска, гэта сьведчыць нам тое, што за ўвесь 1927 г арганізован адзін толькі калгас, на плошчы 42 гэктара, з лікам пайшчыкаў у 5 чалавек. Гэта калектыўная гаспадарка была прыкладнай па вядзеньню культурнай гаспадаркі, праўда, у недастатковай меры, бо малая колькасьць зямлі, не дастатковы лік рабочых рук, не давалі магчымасьці шырока разгарнуць працу калгасу.

У гэтым годзе праца па калектывізацыі вёскі стала галоўнай задачай у раёне, якую беднота, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, стала выконваць на працягу усяго году. І на гэтым гаспадарчым фронце мы маем значныя дасягненьні, так, напрыклад, у 1928 г. арганізавана 6 калгасаў, якімі ахоплена 37 сямействаў, арганізавана адна камуна, у якую ўваходзіць 5 сямействаў.

Адначасова пры правядзеньні калектывізацыі беларускай вёскі, праводзіцца праца сярод наименшасьцяй, культурныя запатрабаваньні якіх павялічваюцца, затым перад савецк й уладай паўстала пытаньне аб паляпшэньні матар'яльнага становішча наименшасьцяй.

З гэтай мэтай арганізавана на быўшай гарадна-садовай гаспадарцы два яўрэйскіх калгасы, адзін у «Трысьвяцы» з 4-х сямействаў і другі ў „Марына-Буды" з 5 сямействаў.

Для калгаснага будаўніцтва ў нашым раёне характэрна тое, што ў калгасы ідзе выключна беднота, што дае магчымасьць на скарэйшае падняцьце калектыўных гаспадарак.

Юрка Шарко.

Слова лічбам.

Партыя і ўлада ўскладае на сыстэму сельгаскаапэрацыі вялікія задачы ў перабудове сельскай гаспадаркі, у яе ўзьнікі і разьвіцьці па сацыялістычнаму напрамку.

Праца сельгаскаапэрацыі за гэтыя чатыры апошнія гады сьведчыць, што галоўная ўстаноўка нашай партыі і ўлады ў працы сельгаскаапэрацыі нашла належны адбітак. Лічбы яскрава сьведчаць аб гэтым. Кааперацыйных аб'яднаньняў на 1-X-24 г. было ў Аршаншчыне 89, на 1-X-26 г.—135, на 1-X-28 г.—299. (Акрамя калгасаў, якіх мы маем на сеньне шні дзень 180, а ў 24 годзе іх было 50).

Рост пайшчыкаў характарызуецца наступнымі лічбамі: 1924 г.—3578 альбо 4 проц. усіх двароў акругі, 1926 г.—21.257, альбо 27 пр., на 1-X-28 г.—41402, альбо 55,1 проц. Рост паявога капіталу 1-X-24 г.—5 460, 1-X-26 г.—77.275, 1-X-28 г.—189840.

Уласныя сродкі на 1-X-24 г.—17540, 1-X-26 г.—127006, 1-X-28 г.—343355. Зварот 24-25 г.—688668 р., 25 26 г.—1111442, 27-28 г.—2.299.800 руб. Прыбыткі 24-25 г.—3.806, 25-26 г.—12164 р., 27-28 г.—30600 р.

Забесьпячэньне сельскай гаспадаркі машынамі, насеньнем і ўгнаеньнем з кожным годам павялічваецца і ў 28-29 гаспадарчым годзе па плянавых меркаваньнях мы павінны адаволіць па снабжэньню ўсе запатрабаваньні акругі.

Дапамога беднае знайшла належны адбітак у практычнай працы сыстэмы с-г. кааперацыі. Кааперавана беднаты на працягу апошніх 3 гадоў 4000 двароў. У час правядзеньня пасяўной кампаніі, асабліва ў апошнюю пасеўкампанію, беднота забясьпечвалася насеннымі матар'ялам, машынамі і ўгнаеньнем.

Кантрактацыя, як адзін са спосабаў узьдзейнічаньня і дапамогі с.-г. гаспадарцы, нашла сваё пралетарскае ў умовах працы с-г. кааперацыі Аршаншчыны. Закантрактавана ўсіх відаў сельскай прадукцыі на 500 000 р., на будучы год маркуецца закантрактаваць прадукцыі сельскай гаспадаркі каля 1.000.000 рублёў.

Шабалтас.

Ворша.

Аб'яднаемся ў кааперативы.

У прамысловасьці Магілеўскае акругі значную долю займае саматужная прамысловасьць і не авангард—саматужна-прамысловая кааперацыя.

Апошняя пачала разьвівацца толькі 3 гады таму назад і за гэты кароткі тэрмін яна мае значныя посьпехі ў справе арганізацыі саматужнікаў у арцелі і таварыствы, канцэнтрацыі збыту вырабаў на кааперацыйнаму руслу, узбуйненьню арцеляў і палепшаньня матар'яльнага быту кааперараваных у арцелі.

Пачатак работы прамкааперацыі Магілеўшчыны адносіцца да пэрыяду арганізацыі саюзу 25-IX-1925 г., які аб'яднаў 11 арганізацый, з таго часу непрарыўна расьце ўся сыстэма, што характарызуецца наступнымі асноўнымі момантамі.

На 1-X-26 г. было 56 арцеляў і 556 сяброў, на 1-X-27 г.—75 арцеляў і 845 сяброў, на 1-X-28 г.—116 арцеляў і 1.580 сяброў. За апошнія тры гады лік арцеляў узрос у 2 разы, лік сяброў у 3 разы.

Адначасова расьце і кааперараваньне саматужнікаў адзіночак. На 1-X-26 г. было 9 т-ваў і 1.520 сяброў, на 1-X-27 г.—15 т-ваў і 2.819 сяброў, а на 1-X-28 г.—15 т-ваў і 3.456 сяброў.

Пайвыя капіталы сыстэмы за 3 гады ўзрастаюць хутка як па саюзу, так і візавой сеткі.

Паралельна з узростам кааперараваных саматужнікаў значна павялічваецца іх валавая прадукцыя і іх удзел у абагуленым сэктары звароту, за лік выцясьненьня прыватных гандляроў.

Да гэтага часу ахоплены значна промыслы: скураны, шавецкі, кравецкі, харчаўкусаны, смалакураны.

Слаба ахоплены вясковыя промыслы, як агнятрывалы і дрэваапрацоўчы. Разьвіты новыя прамыслы, як галянтэрэйны і трыкатажны.

Дагэтуль кааперавана ў арцелі 20 проц. усіх саматужнікаў акругі.

У працягу апошняга году прамкааперацыя пачынае ўцягваць у арцелі жанчын і моладзь у якасьці вучняў.

На 1-X-28 г. лік жанчын складаў 9 6 проц. сяброў арцеляў, а вучні 8,5 проц. і зараз лік іх узрос яшчэ больш.

Замест існаваўшых у горадзе раней дробных аднародных арцеляў, з'арганізаваны буйныя, шляхам узбуйненьня дробных і прыёму новых сяброў.

У бліжэйшы час будуць узбуйнены да 30 чал. і будуць пераведзены на выраб масавых гатункаў, як вопыт, шавецкія арцелі ў Быхаве, Шклове і Касьцюковічах і кравецкія ў Быхаве, Чавусах і Крычаве.

Вынікі 2-хгадовай працы агнятрывалага будаўніцтва на вёсцы.

Самахвалавіцкае т-ва па агнятрываламу будаўніцтву арганізавалася і распачало сваю дзейнасьць у канцы лістапада м-ца 1926 г.

У працягу гэтага часу ў 2-х абсталяваных майстэрнях пры невялікім штату майстроў выпрацавана чарапіцы 3-х гатункаў: шырай, фарбовай і каньковай 150724 шт. Кругоў дзеля пабудовы бэтонна-цэмэнтавых студняў—1746 шт. Пустацелых камянёў станка «Сьмірнова і Берлета» дзеля будынкаў падмуровак—2173 шт. Апрача таго, зроблена ў заказчыкаў—314 штук калодзежных кругоў, пакрыта стрэх—68, выкапана і пабудавана бэтонных калодцаў—85.

Пайшчыкаў лічыцца 293 чал. з сярэдніх паем 4 руб. 10 кап. Т-ва ў працягу 2-хгадовай працы мае чыстага прыбытку ў суме 1130 р. 74 к.

Попыт на вырабы асабліва на калодзежныя кругі вялікі, так што т-ва не пасьпявае задаволіць своечасова і поўнасьцю заказаў насельніцтва. Праўда, былі выпадкі спыненьня працы за адсутнасьцю цэменту, якога і на будучы час вызначана т-ву на 60 проц. менш, супроць яго заяўкі, але т-ваи маркуецца, згодна пастановы РВК рэарганізаваць Навадворскае агнятрывалае т-ва, якое працы вілкай не вяло і адч ніць там адзяленьне. Так што праца агнятрывалага будаўніцтва на вёсцы на будучы час больш шырэй разгорнецца і забясьпечыць поўнасьцю запатрабаваньні насельніцтва.

Г.

м. Самахвалавічы, Менск. акр.

Вылучаем актыўных будаўнікоў сацыялізму.

Батрак—на адказнай працы.

(ВЫЛУЧЭНЕЦ ГАЛЕЦКІ).

Нарадзіўся ён у сям'і селяніна батрака.

Шмат гадоў бацька гнуў сваю сьпіну для пана маёнтка Іванаўск.

З 13-цігадовага ўзросту да Кастрычнікавай рэвалюцыі—Галіцкі Канстанцін працуе рабочым маёнтку Іванаўск.

Пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі ў працягу 4-х гадоў ён працуе батраком у розных савецкіх гаспадарках Бярэзінскага раёну.

У 1919—23 гадох Галецкі актыўна ўдзельнічае па зьліквідаваньні бандытаў у розных вёсках Бярэзінскага раёну.

П ступова Галецкага высоўваюць на розныя выбарчыя пасады.

У 1925 годзе ён абіраецца прафупаўнаважаным па рабоце сярод батракоў па Бярэзінскаму раёну.

З лістапада 1925 году ён прызначаецца загадчыкам Барысаўскай акруговай Біржы Працы.

На гэтай пасадзе ў працягу 2-х гадоў, ён энэргічна садзейнічаў па зьліквідаваньні беспрацоўя на Барысаўскай акрузе, прыцягваў адміністратараў за ўхіленьне ад найму рабочых бяз Біржы Працы і г. д.

З красавіка 27 году Галецкі накіроўваецца ў г. Маскву на ўсесаюзныя курсы інспэктароў працы і з зваротам з курсаў Галецкі, за скарачэньнем Барысаўскай акругі працуе ў якасьці акруговага інспэктара працы.

Будучы нялосьць пісьменным (скончыў ён I ступень партшколы) Галецкі свае абавязкі выконваў надта добра.

У сучасны момант дапамагае сваім братом батракоў і зьвяўляецца старшынёй саюзу прац. зямлі і лесу па Барысаўскаму і Халопеніцкаму раёнах.

Галецкі зьвяўляецца сябром партыі з 1926 г. і на гледзячы на свой малады ўзрост (яму 23 гады) свае абавязкі ён досыць добра выконвае і здаволен сваёй працай.

Паміж іншым, Галецкі нясе шмат абавязкаў па партыйнай лініі.

Рабкор.

Барысаў.

Работніца—у руля ўлады.

У сучасны момант на прадпрыёмствах і установах Барысава працуе 2.395 жанчын.

У мінулым годзе ў гэты час налічвалася на прадпрыёмствах 2.309 жанчын.

Кваліфікаваных жанчын налічваецца 414 чал.

Дырэктыва аб падняцьці кваліфікацыі работніц выконваецца. Усяго на прадпрыёмствах вылучана для падняцьця кваліфікацыі 63 жанчыны, але-ж гэта складае зусім нязначны процант да агульнага ліку працуючых жанчын,

Па прадпрыёмствах гэтае вылучэньне мае наступны малюнак: на ф-цы «Чырвоная Бярэзіна»—вылучана 1 жанчына на пасаду сьлесара; на заводзе «Домбаль» вылучаны 10 жанчын, з іх на пасады майстроў—2 жанчыны, фэйноўшчыц—3 жанч., паліроўшчыц—4 жанч., сартыроўшчыц—1 жанчына і акрамя гэтага будуць вылучаны на гэтым заводзе 7 жанчын.

На заводзе «Камінтэрн» для падняцьця кваліфікацыі вылучана 11 жанчын на пасады—паліроўшчыц, ножаточак, к сушыльнаму прэсу і інш.

Па саюзу працасьветы было паслана 9 жанчын на 6-тыднёвыя курсы па перападрыхтоўцы настаўнікоў.

Па саюзу медсанпрацы 19 санітарак перакваліфікаваны ў сёстры.

Акрамя гэтага 13 жанчын вылучанак працуюць на розных адказных пасадах, як старшыні і сакратары ФЗМК, загадчыкі кааперацыйных крам, загадчык тэкстыльнага прапаганды, камісія дапамогі дзецям і інш.

На адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады вылучаны 2 жанчыны (заг. цэхамі „Чырв. Бярэзіны").

У напрамку паляпшэньня быту работніц у мінулае лета прафарганізацыямі былі адчынены дзіцячыя пляцоўкі, за фонд ¹/₄% адлічэньняў адчынена пры заводзе „Домбаль" ясьлі на 10 ложак.

Ахоплена было дзіцячымі пляцоўкамі 425 дзяцей, садамі і ачагамі—100 чал. і ясьлямі 160 чал.

Існаваўшы ў горадзе „Дом дзіцяці" рэарганізован быў у ясьлі на 50 ложак.

Для палепшаньня стану здароўя работніц, накіраваны была ў розныя дамы адпачынку, санаторыі, курорты ў 1927-28 г. г.—262 жанчыны.

Лік жанчын пайшчыкаў кааперацыі ў сучасны момант 1350 чал., з якіх зьвяўляюцца ўпаўнаважанымі крамных камісій—25 жанчын.

Удзел жанчын у дабраахвотных арганізацыях дастатковы.

Сябрамі Мопр'у зьвяўляюцца—350 чал., Асоавіяхіму—1036 чал.

Удзел у дабраахвотных арганізацыях адначаецца ў напрамку збору сродкаў палітзьняволеным, рэчаў, удзел у гурткох ваенізацыі, распаўсюджаньні вайсковай літаратуры, удзел у паходах, манэўрах і інш.

Клібанаў.

(Барысаў).

Ідзём наперад.

(Расткоўскі с-с, Лядзянскі р. Аршаншчына).

Яшчэ ў пачатку 1928 году пры Расткоўскім с-с арганізавалася машынное таварыства „Культура".

Адразу пасьля арганізацыі яно ўзялося за працу. Усяго ў таварыстве налічваецца звыш 30 чалавек сяброў сялян-беднякоў.

У таварыстве маецца сельска-гаспадарчых прыладаў: акучнік, малатарня, пружынная барана і інш., якія куплены ў Лядзянскім сельска-гаспадарчым таварыстве ў крадзьк.

Гэта таварыства вельмі маладое, але яно з кожным днём ідзе наперад. Толькі яно дапамагло выйсьці з рук кулака, сяляне кажуць „што лепш ісьці да таварыства чым да кулака, бо хоць і аддасі грошы, дык яны пойдуць на дзелёны яго рост".

Больш-бы такіх таварыстваў, якія б былі, прыкладам для сялян і вывадзілі вёску наперад да лепшага жыцьця і будавалі правільна сваю сельскую гаспадарку.

Мак—скі.

Н. КРУПСКАЯ.

Ленін аб уменьні пісаць для рабочых і сялянскіх мас.

„Я нічога так не жадаў-бы, ні аб чым так многа ня марыў, як аб магчымасьці пісаць для рабочых»—пісаў Уладзімір Ільліч з сібірскай ссылкі заграніцу Паўлу Барысавічу Аксэльроду (ліст ад 16-VIII 1897 г.).

Ужо і да 1897 году Уладзімір Ільліч пісаў для рабочых.

У 1895 г. ім была напісана брашура для рабочых—«Об'яснение закона о штрафах, взимаемых с рабочих на фабриках и заводах».

Брашура гэта была надрукавана нелегальна ў 1895 годзе ў Лахцінскай друкарні.

У 1895 г. група пецярбургскіх с-д., стаўшая потым вядомай пад назвай «Саюзу барацьбы за вызваленьне рабочай клясы», куды ўваходзілі Ленін, Кржыжаноўскі, Старкоў, Радчэнка, Ванеєў, Сільвін, Якубаў і інш., паставіла сабе мэтай выдаваць нелегальны часопіс для рабочых — «Рабочее дело». Калі першы нумар быў ужо гатоў, былі зроблены арышты, прычым у Ванеева быў арыштаваны рукапіс гэтага нумару. Для гэтага часопісу напісан У. І. артыкул—«О чем думают наши министры».

З турмы Уладзімір Ільліч у кніжцы перасылаў дзьве праклямацыі для рабочых—«Рабочий праздник 1-го мая» і „К царскому правительству».

Аксэльрод і Плеханаў вельмі добра адазваліся аб брашуры Ільліча — «Об'яснение закона о штрафах».

У тым-жа лісьце да Аксэльрода ад 16-VIII-1897 г. Ільліч пісаў: «Вашы і яго (Плеханава) водзывы аб маіх літаратурных пачынаньнях (для рабочых) няне надзвычайна абадзёрылі».

Маладым пісьменьнікам, жадаючым навучыцца пісаць так, каб быць зразумелымі шырокімі масамі, трэба ўважліва вывучыць гэтыя працы Ільліча.

Калі мы пагледзім на брашуру «Об'яснения закона о штрафах», дык убачым, што брашура гэта напісана вельмі простай мовай, але разам з тым мы ўбачым, што яна вельмі далёка ад навярхоўнай агіткі, якія ў вялікай колькасьці выпушчаюцца і да гэтага часу. У брашуры няма зусім агітацыйных сказаў, заклікаў. Але самы выбар тэмы вельмі характэрны. Гэта тэма, якая вельмі хвалявала ў той час рабочых, была блізка рабочым. Брашура ўся ўзята з канкрэтных, добра знаёмых рабочаму, фактаў і абгрунтавана старанна сабранымі в розных крыніц фактамі. У брашуры гаворыць, пераконваюць ня словы, а справы, факты. Яны так красамоўна, пераконваюча гаворыць, што рабочыя, знаёмячыся з імі, самі робяць вывады.

У невялічкім артыкуле «О чем думают наши министры?—Ленін трымаецца такога-ж падыходу да чытача, як і ў «Об'яснении закона о штрафах». Ён бярэ ліст міністра ўнутраных спраў Дурново да обер-пракурора сьвяцейшага сыноду Пабеданосцава, разьбірае яго і падводзіць рабочых да вываду: «Рабочыя, вы бачыце, як да сьмерці баяцца нашы міністры заўчэньня ведаў з рабочым людам! Пакажэце-ж усім, што ніякая сіла ня зможа паралізаваць у рабочых сьвядомасьць! Без ведаў рабочыя нічога ня могуць зрабіць, з сьвядомасьцю яны—сіла»!

Праклямацыя «Рабочий праздник 1 мая» пісана з турмы і адносіцца да 1896 г. Але калі-б мы і ня ведалі, у якім годзе яна напісана, дык гэта лёгка было-б вызначыць па характару самой праклямацыі. У ёй гаварылася аб міжнародным сьвяце рабочых, аб міжнароднай барацьбе рабочых, але галоўным пунктам было тагочаснае становішча рабочых буйных цэнтраў, іх барацьба. Праклямацыя вывучала перспэктывы гэтай барацьбы і была непасрэдным заклікам да стачачнай барацьбы.

Праклямацыя выйшла 1 мая 1896 г., а ў чэрвені ў Пецярбурзе баставала ўжо 30 тысяч тэкстыльш.

Другая праклямацыя «Царскому правительству» падагульнала вынікі забастоўкі і заклікала да далейшай, больш глыбокай барацьбы. Праклямацыя канчалася словамі: «Стачки 1895-1896 г. не прошли даром. Они сослужили громадную службу русским рабочим. Они показали, как им следует вести борьбу за свои интересы. Они научили их понимать политическое положение и политические нужды рабочего класса».

Увосень 1897 г. Уладзімір Ільліч працуе над другой сваёй брашурай для рабочых, напісанай па таму-ж тыпу, што і першая. Брашура называецца—«Новый фабричный закон». У 1899 г. напісаны былі брашуры—„О промышленных судах" і «О стачках».

Праца над гэтымі брашурамі дапамагла Леніну ашчэ лепш навучыцца пісаць і гаварыць так, што яго прамовы і артыкулы сталі асабліва блізкімі і зразумелымі масе.

Але, шмат працуючы над тым, каб больш зразумела, лепш перадаць свае думкі, Ільліч у той-жа час абураўся ўсякай вульгарызацыяй, імкненьнем зваліць перад рабочым пытаньне, спрасьціць яго. Ільліч пісаў у «Что делать» (1901-1902 г.): «Главное внимание должно быть обращено на то, чтобы поднимать рабочих до революционеров, отнюдь не на то, чтобы опускаться самим непременно до «рабочей массы», как хотят экономисты, непременно до «рабочих-середняков», как хочет «Свобода» (поднимающаяся в этом отношении на вторую ступеньку экономической «педагогики»). Я далек от мысли отрицать необходимость популярной литературы для рабочих и особо популярной (только, конечно, не балаганной) литературы для особенно отсталых рабочих. Не меня возмущает это постоянное припутывание педагогики к вопросам политики, к вопросам организации».

Ільліч з абурэньнем адносіцца да ўсякага сюсюканьня з рабочымі, да замены сур'ёзнага абгаварэньня пытаньня «прыказкамі і фразамі».

У прамовах і артыкулах Ільліча рабочыя заўсёды бачылі, што Ільліч, як казаў адзін рабочы, гаворыць з намі «усур'ёз».

У 1903 годзе, калі пачаліся стыхійныя сялянскія паўстаньні, Ільліч піша папулярную брашуру «к деревенской бедноте», дзе растлумачвае беднаце, за што змагаюцца рабочыя і чаму вясковай беднаце трэба ісьці з рабочымі.

У ліпені 1905 г. Ільліч піша сваю вядомую лістоўку—«Три конституции или три порядка государственя го устройства» (Том VII, стар. 377-378). У лістоўцы раўнаюцца самаўладная манархія, канстытуцыйная манархія і дэмакратычная рэспубліка па форме, зьместу і мэтавай устаноўцы. Лістоўка—узор навочнасьці і папулярнасьці, але ў той-жа час узор сур'ёзнага разважаньня, узор гутаркі «усур'ёз».

У цяжкія пераломныя моманты камуністы, водзуг думкі Леніна, асабліва абавязаны пісаць і гаварыць папулярна. На канфэрэнцыі 1917 г. (адбылася ў красавіку) Уладзімір Ільліч гаварыў: «Многим, в том числе и мне лично, приходилось выступать перед солдатами, и я думаю, что если разъяснять все с классовой точки зрения, то для них более всего не ясно в нашей позиции, как именно мы хотим кончить войну, как мы считаем возможным ее кончить. В широких массах есть тьма недоразумений, полного непонимания нашей позиции, поэтому мы должны быть наиболее популярными» (Том XIV, ч. II, стар. 416 старога выд.).

У той-жа прамове Ленін гаварыў: «Выступая перед массами, надо давать им конкретные ответы. Нужна ясность политической мысли». «Ч о не хватает в братании,—это ясной политической мысли». Гаворачы аб тым, што правесьці прапануемыя ўмовы міру немагчыма без надрыву папаваньня капіталістаў, Ленін настайваў, што гэту думку трэба зрабіць зразумелай масам: «Еще раз повторяю: для неразвитых народных масс эта истина требует посредствующих звеньев, которые вволили-бы в вопрос неподготовленных людей. Вся ошибка и вся ложь популярной литературы о войне состоит в том, что этот вопрос обходят, об этом молчат, изображая дело так, что не существовало никакой борьбы классов, а как будто две страны жили дружно и одна на другую напала, а та обороняется. Это является вульгарным рассуждением, в котором нет ни тени об'ективности, это сознательный обман народа со стороны образованных людей».

Падагулім вынікі. Ленін надаваў вельмі вялікае значэньне ўменьню гаварыць і пісаць папулярна. Гэта неабходна, каб зрабіць даступным, зразумелым масе камунізм, як свая ўласная справа. Папулярная прамова, папулярная брашура павінна мець канкрэтную мэту; мэту, якая пабуджае да паўнай дзейнасьці. Палітычная думка, якая разьвіваецца ў папулярнай прамове, павінна быць выразнай, яснай, значнай. Недапушчальна ніякая вульгарызацыя, спрашчэньне, адхіленьне ад об'ектыўнасьці. Выкладзена павінна быць дакладна па свайму пляну, трэба дапамагаць слухачу ці чытачу самому рабіць вывады і толькі падагульваць, фармуляваць гэтыя ўжо ўсьвядомленыя слухачом або чытачом вывады.

Так вучыў папулярна гаварыць і пісаць Ленін.

У перажываемы момант папулярная літаратура набывае асабліва значэньне і абавязкова клясавай барацьбы патрабуе, каб масы як мага ясьней зразумелі сітуацыю, навучыліся разумець сувязь хвалюючых іх фактаў штодзённага жыцьця з асноўнымі пытаньнямі барацьбы за сацыялізм. Гэткай літаратуры да сьмешнага мала. Трэба яе стварыць. Трэба вучыцца ў Леніна, у мас, як пісаць папулярна. Уменьню пісаць папулярна трэба вучыцца, бяручыся за працу, калектыўна працуючы над выпрацоўкай у сябе ўменьня пісаць, правяраючы на практыцы дасягнутыя посьпехі.

Шляхі лясное гаспадаркі Магілеўшчыны.

(ЛІСТ З МАГІЛЕВУ).

Калі зьвярнуць увагу на становішча лясное гаспадаркі ў дарэвалюцыйны час, дык можна сказаць, што лясной гаспадаркі на Магілеўшчыне ня было, а былі вучасткі і дачы лясоў.

Да рэвалюцыі на тэрыторыі сучаснай Магілеўшчыны ўсяго было 736549 гэкт. лясоў, што ў сярэднім складала лясістасьць у 39 процантаў, якія разьмяркоўваліся наступным чынам: скарбовых 8 процантаў, сялянскіх—7, абшарніцкіх—84, царкоўных—0,5 і гарадзкіх—0,5 процантаў

Такім чынам, увесь лес быў у прыватным карыстаньні абшарніка, які распрадаваў яго па ўмовах самай варварскай рубкі, аб чым добра сьведчыць гісторыя 80-тых гадоў. «Лес прадаваўся на плошчы ад краю дачы і да краю, прычым згодна на рубку складалася на ўмовах працягу 12 гадоў".—Гэта значыць, мала таго, што адразу вырубаўся цэлы вучастак лесу, вырубаліся і ўсе маладыя дрэўцы, якія праз дзесяць гадоў зноў маглі адрасьці.

Вось гэтае становішча і прывяло да таго, што да Кастрычнікавае рэвалюцыі было зьнішчана лесу на плошчы 23456 гэктараў, што ў кожны год безадкладна зьнішчалася лесу на 7 тысяч гэкт. Побач з тым, што наогул плошча лясоў зьмяншалася, яшчэ большай хваробай зьявіўся той факт, што становішча лесу было ў дрэнных умовах.

Лес, як аб'ект гаспадаркі, бязумоўна патрабуе плянавасьці і гаспадарчага разьліку ў карыстаньні драўнінай каб забаваць бязупыннае карыстаньне; гэта-ж можа быць пры ўпарадкаваньні гаспадаркі. У той-жа час упарадкаваньне праводзілася толькі ў скарбовых лясох, абшарніцкія-ж лясы заставаліся зусім неўпарадкавальнымі і да часу рэвалюцыі. Пры адсутнічаньні пляну гаспадаркі і парадку рубкі ў абшарніцкіх лясох, шырока практыкаваліся выбарчыя рубкі, як камэрцыйна выгадныя. Вось гэткім становішчам лясы Магілеўшчыны зусім зьнішчаліся, зьменшыўшы нават іх прырост і наогул запасы драўніны.

Пасьля рэвалюцыі ў Магілеўшчыне мелася 500992 гэк. лясной плошчы, што складала 26 проц. лясістасьці; прычым становішча нацыяналізаванага лесу было ў самым бесгаспадарчым выглядзе: вырубы, гары, недарубы, забруджанасьць, распашкі,—усё гэта ставіла пяжкую задачу савецкай уладзе стварыць лясную гаспадарку ва ўмовах зьбераженьня лесу пры карыстаньні драўнінай.

Адгэтуль перш-на-перш выплыла неабходнасьць упарадкаваць лясную плошчу. Усяго з 1918 году па 1928 перададзена ў зялёны фонд 55119 гэк., а астатняя плошча лясного фонду разьмяркована наступным чынам: у дзяржаўны фонд—322539 гэк. і лясоў мясцовага значэньня 123334 гэкт.

Другая галоўная задача была пастаўлена—гэта стварэньне лясной гаспадаркі на падставах плянавасьці і эканамічна-гаспадарчага разьліку, вывяўшы аб'екты лесу ў поўных лічбах. У зьвязку з чым было пачата ў шырокіх разьмерах упарадкаваньне лясоў з адмежаваньнем усяго лясного фонду. І калі да рэвалюцыйнага часу па ўсёй акрузе было ўпарадкавана ўсяго 2 пр. лесу, дык да восені 1928 году ўжо ўпарадкавана—198420 гэк., з якіх дзяржаўных лясоў 143054 гэк. і лясоў мясцовага значэньня 55366 гэк., што складае 45 проц. ад усёй плошчы лясоў.

Пры лесаўпарадкаваньні гаспадараў дэталёва вывучаліся ўмовы яе, становішча дрэвастану, выяўленьне ўсіх магчымасьцяй найбольшага скарыстоўваньня карыснасьцяй ад лесу, якія маюць вялікае эканамічнае значэньне ў народнай гаспадарцы.

Далей стаяла задача аб аднаўленьні лесу. Да гэтага часу аднаўлена да 15 тысяч гэк. плошчы, з якіх натуральна аднаўлена 7000 гэк. Адначасова з аднаўленьнем лесу, праведзена ачыстка лесу, якая прыблізна выявілася на 90 процантаў. Таксама наогул уведзен дагляд за лесам. У мэтах правідловай вытворчасьці ўсіх народ, на дагляду за лесам і своечасовага скарыстаньня драўніны пры акруговым лясным інспэктарыяце ўтворан апарат спэцыялістых, якія праводзяць рубкі і абчыстку лесу, а таксама вядуць камэрцыйны бок працы на падставах эканамічна-матар'яльнай вытворчасьці.

Лесзагі на Магілеўшчыне ўтворан у 1924 г. і за час распрацовак 26-27 і 27-28 г. распрацавана 477 тысяч куб. мэтр. на суму 3388922 руб., прычым мясцовому насельніцтву за распрацоўку і возку выплачана 677784 руб. Прыкладна 30 проц. ад колькасьці зарыта

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА МЕРАПРЫ�ЁМСТВЫ ДЛЯ ХЭМІЗАЦЫІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР.

Для ўзмацненьня хэмізацыі народнай гасп. аркі БССР, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. Утварыць пры Савеце Народных Камісараў БССР камітэт для хэмізацыі народнай гаспадарки БССР у наступным складзе:

Старшыня тав. Карклін, М. М., намесьнікі старшыні: т.т. Масюкоў, праф. Прылежаеў і інжынер-хэмік Патансон.

Члены прэзыдыуму т. . Яндульскі, Сосноўскі, Барсукоў, Гарецкі, Г. і хэмік Савкін.

Члены камітэту: 1. праф. БДУ Змачынскі, 2. праф. С.-Г. Акадэміі Шкляелаў, 3. дырэктар хэм.-фарм. заводу Сініцын, 4. праф. БДУ Бястужаў, 5. праф. БДУ Экземпярскі, 6. прадпрацаўнік НДІ ім Леніна праф Скандракоў, 7. прадпрацаўнік НДІ імя Леніна спэц.-хэмік Трус, 8. праф. С.-Г. Акадэміі Недраў-Зіхман, 9. праф. С.-Г. Акадэміі Алексеў, 10. старшыня інжын.-хэмічны інжынер-хэмік Савінкі, 11. прадпрацаўнік РСНГ БССР горны інжынер Розін, 12. заг. хэміка-техн. лябар. інж.-хэм. Гуровіч, 13. дырэктар заводу «Чырвоны Хэмік» інжынер-хэмік Ананевіч, 14. інжынер-тэхнолёг Шклотрэсту Цыперовіч, 15. інспэктар Дасьледчае Справы НКЗ Савінкі, 16. дырэктар Торгавай Станцыі Бахнеў, 17. інспэктар НК Землярэбства Міхайлаў, 18. інжынэр Дзяржаўнай Плянавай Камісіі Кандан, 19. інжынер-хэмік С.-Г. Акадэміі праф. Красікаў, 20. праф. Геалёгічнага Інстытуту Бледухо, 21. нам. дырэктара Мэталёрграсту Любамірскі, 22 адказны сакратар сэкцыі хэмікаў Кудрэў, 23. ад НК Асьветы член Нав.-Мэтад. Камітэту Кугель, 24. ад Белсельсаюзу Талапіла, 25 ад Асоаві хіму намесьнік старшыні Цэнтр. Савету Дрылёнак, 26. Начальнік Хэмічнай Службы Беларускай Ваеннай Акругі Затоўскі.

У работу камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР павінны быць, апроч таго, уцягнуты прадстаўнікі інжынэрна-тэхнічных сэкцый, прафэсыянальных арганізацый, рабочыя, прапаўнікі вышэйшых школ, кансультанты іншых саюзных рэспублік, кансультанты з-за межаў і г. д.

II. Па камітэт для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР усклаваецца распрацоўка асноўных дырэктыў для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР, уж цьцё вахадаў для дапамогі справе хэмізацыі і агульнае кіраваньне работаю адпаведных органаў у частны хэмізацыі.

III. Першачарговымі задачамі камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР вызначаецца дэтальная навукова-тэхнічная і эканамічная распрацоўка наступных праблем: укараненьня ў масовыя галіны прамысловасьці і вытворчасьці сельскай гаспадаркі і аховы здароўя і іншых заваёваў сучаснай хэміі; ужываньня ў сельска-гаспадарцы штучных угнаеньняў і інсэктысыдаў; арганізацыя прамысловасьці сельска-гаспадарчых угнаеньняў; пашырэньня ўнутранай сыравой базы і рацыянальнага яе карыстаньня; узмацненьня хэмічнай перапрацоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў; пашырэньня і індустрыялізацыі лесахэмічнай гаспадаркі; арганізацыі хэмічнай перапрацоўкі торфу; утварэньня гідраэнергетычнай базы для разьвіцьця электрахэмічнай вытворчасьці (зьвязанага азоту, карбіду, кальцыя, каустычнай солі); перапрацоўкі лекавых расьлін.

IV. Камітэт для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР павінен устанавіць беспасрэдную сувязь з Навукова-Дасьледчымі Інстытутамі і асобнымі вучонымі БССР, распрацаваць з імі плян практычнай дасьледчай работы на бліжэйшы час і ўжыць заходы для стварэньня дастаткова-спрыяльных, матар'яльна-тэхнічных і працовых умоў для іх работы на тэрыторыі БССР.

V. Ускласьці на дзяржаўную плянавую камісію пры Савеце Народных Камісараў БССР з удзелам камітэту для хэмізацыі распрацоўку пляну хэмізацыі рэспублікі, які павінен увайсьці асобным разьдзелам у перспэктыўны плян народнай гаспадаркі.

VI. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі БССР і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры Савеце Народных Камісараў БССР пры распрацоўцы 5-цігадовага пляну прадугледзіць максымальнае ўзмацненьне тэмпу хэмічнай прамысловасьці, у першую чаргу заводаў для хэмічнай перапрацоўкі руд, торфу і драўніны для ўгнаеньня.

VII. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі БССР ужыць заходы да пашырэньня і ўзмацненьня цэнтральнай лябараторыі ВСНГ БССР і сеткі заводзкіх хэмічных лябараторый, а таксама і да колькі-снага ўзмацненьня тэхнічных кадраў на прадпрыёмствах хэмічнай прамысловасьці.

VIII. Лічыць патрэбным пашырыць і якасна ўзмацніць існуючую сетку навукова-дасьледчых устаноў БССР, арганізаваўшы пры іх, а таксама пры вышэйшых школах спэцыяльныя навукова-дасьледчыя катэдры па хэміі. Даручыць камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР ужыць заходы да максымальнага скарыстаньня іх для патрэб хэмізацыі народнай гаспадаркі рэспублікі.

IX. Лічачы асабліва важнаю задачу па сыстэматычнай падрыхтоўцы хэміка-тэхнічных навуковых кадраў, даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы, з удзелам камітэту для хэмізацыі, ужыць заходы да хутчэйшага ўтварэньня хэміка-тэхнічнага факультэту пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце і распрацаваць пытаньне аб патрэбных мерапрыёмствах для ўзмацненьня сыстэмы аспірантуры пры вышэйшых навучальных і навуковых установах БССР у галіне хэмічных дысцыплін.

X. Каб узмацнець сувязь навуковых прамысловых арганізацый з сучаснаю тэхнікаю і перадавою навуковаю думкаю, даручыць камітэту для хэмізацыі БССР ужыць заходы да ўзмацненьня камандыровак у навуковыя цэнтры СССР і за межы вучоных інжынэраў і кіраўнікоў хэмічнай гаспадаркі, а таксама распрацаваць м'тады скарыстаньня камандыровак вучоных, інжынэраў і кіраўнікоў іншых галін народнай гаспадаркі ў справе ўзмацненьня хэмізацыі БССР.

XI. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі і камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР і Народным Камісарыятам Працы і Асьветы БССР ужыць тэрміновыя захады для ўпарадкаваньня цяперашняй сыстэмы практыкантства і стажорства студэнтаў-хэмікаў і да ўзмацненьня навукова-хэмічнай падрыхтоўкі вучняў на ўсёй сетцы народнай асьветы.

XII. Даручыць камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР ужыць захады да палепшаньня хэміка-тэхнічных аддзелаў спэцыяльных бібліятэк і да належчаньня індывідуальнай выпіскі спэцыяльнай чужаземнай літаратуры.

XIII. Даручыць камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР разам з Народным Камісарыятам Асьветы БССР распрацаваць плян скарыстаньня дзяржаўных палітыка-асьветных устаноў для прапаганды пытаньняў хэмізацыі рэспублікі і распрацаваць практычныя мерапрыёмствы для ўцягненьня ў работу для папулярызацыі ідэй хэмізацыі перыядычнага друку, а таксама і шырокіх грамадзкіх і прафэсыянальных арганізацый.

XIV. Асыгнаваць з рэзэрвовага фонду Савету Народных Камісараў у распарадженьне камітэту для хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР дваццаць тысяч (20.000) рублёў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

9 студзеня 1929 году г. Менск.

Хімізацыя народнай гаспадаркі БССР.

Народна-гаспадарчае разьвіцьцё ў БССР павінна мець такі тэмп у сваім разьвіцьці, каб у поўным сэнсе слова адпавядаць агульнай установцы Савецкага Саюзу.

Дзякуючы гэтаму, наш тэмп працы і дасягненьні павінны быць асабліва высокія. Мы павінны аддаваць усю нашу ўвагу пытаньням узмацненьня і стварэньня найбольш высокіх вытворчых магчымасьцяй у нашай краіне. Мы зараз асабліва напіраем на правядзеньне мер па сацыялістычнай рэканструкцыі, па падчыненьню пралетарскай дыспыпліны працы, на ўзмацненьню плянавасьці і здзяйсненьня недахопаў у гэтай справе, па падняцьню тэхнікі на вышэйшую ступень і вакуул навукова-дасьледчай працы.

Але гэта ўсё яшчэ недастаткова, гэта неахопліва яшчэ адна вельмі важная частка нашых навуковых магчымасьцяй—дасягненьняў нашай хіміі. Да пытаньня ўкараненьня хімічных працэсаў у народнай гаспадарцы мы яшчэ не змагалі так блізка падыйсьці, як-бы гэта было патрэбным. Гэтая праца и куль што ўсё яшчэ знаходзіцца ў вадта кепскім стане, ня гледячы на тое, што інтарэс народнай гаспадаркі безадкладна дыктуюць неабходнасьць звярнуць больш увагі на хімізацыю народнай гаспадаркі.

Калі мы возьмем нашу сельскую гаспадарку і ажыцьцяўленьне задач на падняцьцю ў бліжэйшае пяцігодзьдзе ўраджайнасьці ня менш як на 35 проц., то гэту задачу магчыма ажыцьцёвіць ня толькі мерамі эканамічнымі, палітычнымі, ці аграрна-прапагандысцкімі, але, галоўным чынам, і мерамі хімічнымі.

Калі мы падыдзем да прамысловасьці і ў прыватнасьці да пытаньня аб зьніжэньні сабекошту прамысловай прадукцыі, то тут мы стыкаемся з неабходнасьцю большага прымяненьня хімічных працэсаў, якія змогуць зрабіць значны ўплыў на зьніжэньне сабекошту.

Калі з большага прагледзець нашы матавыя ўстаноўкі, якія мы намячаем у народнай гаспадарцы на часьці хімізацыі, то яны ў асноўным зімкнічаюцца ў наступным: на сельскай гаспадарцы—магчымасьці і неабходнасьць укараненьня штучных угнаеньняў і селекцыйнае і хімічнае ачышчэньня насеньня; выпрацоўка больш даступных сродкаў барацьбы са шкоднікамі: вапна тытуновы экстракт, тытуновы пыл і г. д.; хімічная перапрацоўка сельска-гаспадарчых прадуктаў і сельска-гаспадарчых адкідаў і адходаў; выпрацоўка штучных пластычных мас, так званага галаліту, перапрацоўка адходаў і адкідаў бойняў, атрыманьне тлушчу, клею, альбуміну, а таксама выпрацоўка маргарыну і іншых штучных тлушчавых прадуктаў.

На леса-хімічнай прамысловасьці, якая мае асабліва багатыя перспэктывы ў БССР што індустрыялізацыя гэтай прамысловасьці і поўная яе рэканструкцыя нам далёка яшчэ не дасягнута. Значнасьць прыдзецца пайсьці на лініі пашырэньня і плянаваньня ўвядзеньня пазочных гаспадарак дзеля злабываньня шпігіцару і канфолі, выпрацоўкі дэлюлёзы і г. д.

Пры нашых багатых залежах торфу ў Беларусі мы таксама можам мець дасягненьні, калі глыбей пашырым хімічныя працэсы ў нашы тарфяныя балоты, у прыватнасьці праводзячы газафікацыю дзеля атрыманьня газу, аміачных угнаеньняў, смалы і коксу, адначасна вывучаючы пытаньне на стварэньню тарфянага коксу і атрыманьня вадзьга аналу з торфу, як і перапрацоўкі торфу ў сьпірт, як і прымяненьне торфу і атрыманьне камбінаваных угнаіцельных парашкоў.

Калі толькі пайсьці па гэтых м'тавых установках, то мы бачым, якія багатыя перспэктывы можа сабе намеціць наша хімічная прамысловасьць і наогул хімізацыя БССР. Але для гэтага патрабуюцца ня толькі сродкі і тэхніка, але і людзкая сіла, пытаньне аб якой вырашаецца.

Мы зараз стаім перад складаньнем і канчатковым зацьверджаньнем нашага пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі. У гэтым пляне мы бачым (у праекце), якія ўжо вялікія заданьні намячаюцца па хімізацыі народнай гаспадаркі. Напрыклад, калі ў 1928-29 годзе наша сельская гаспадарка зможа карыстацца мінеральнымі угнаеньнямі прыблізна ў колькасьці 52 тыс. тоны, то ў канцы пяцігодзьдзя, у апошні год сельская гаспадарка ўжо зможа скарыстаць іх у колькасьці 300—335 тыс. тон, ці за ўсё пяцігодзьдзе прыдзецца даць мінеральнага угнаеньня каля 900 тыс. тон.

Калі мы прагледзім зараз нашу хімічную прамысловасьць, то ўбачым, што яе ўдзельная вага складае ва ўсёй прамысловасьці каля 5 проц., але калі выкінуць сірніковую прамысловасьць, якая складае 84 проц., то хімічная прамысловасьць займе ва ўсёй прамысловасьці Беларусі толькі 0,8 проц. Праўда, у канцы пяцігодзьдзя ўдзельная вага ўсёй хімічнай прамысловасьці мае заняць каля 8 проц. Гэта ўжо зьяўляецца вялікім ростам, але далёка яшчэ не задавальняючым попыту усёй народнай гаспадаркі, хоць валавая прадукцыя ўсёй хімічнай прамысловасьці па гэтай праграме і павінна вырасьці на 450 проц., прычым рост рабочай клясы будзе в 34 тыс. да 75 тыс., кошт капітальных работ—в 2,600 тыс. р. у мінулым годзе патэнцыецца ў канцы пяцігодзьдзя да 9 млн. руб. ці за пяцігодзьдзь пэрыяд—каля 36 млн. руб.

Адсюль вынікае адна з сурёзьнейшых задач—арганізаваць апарат (аб чым ужо маецца пастанова СНК БССР), які быў-бы забясьпечаны ў законадаўчым парадку ўсімі неабходнымі правамі для таго, каб, вывучаючы, сарыяючы, кантралюючы прыцягнуць усе навуковыя сілы, рабочыя арганізацыі і г. д. і згуртаваць іх вакол пляну па хімізацыі народнай гаспадаркі, каб намечаны тэмп, які зараз павінна мець наша народная гаспадарка, быў сапраўды ажыцьцёўлен на справе.

М. Карклін.

МЕНСКІ АКРУГОВЫ ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ

АБВЯШЧАЕ,

што на падставе арт. 24 увагі 1-й Палажэньня аб мясцовых фінансах БССР, па ўзгадненьню з Эканомнарадай БССР З 25-ГА СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ

ўводзіцца спагнаньне мясцовага падатку з прывазімых і вывазімых цяжараў на станцыі Рудзенск Заходніх чыгунак.

Загадчык акрфінаддзелу ВОСТРЫКАЎ.

У прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

12 студзеня 1929 году пад старшынствам тав. А. Г. Чарнякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. Разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ДРЫСЕНСКАГА РВК.

Заслухан даклад старшыні Дрысенскага РВК тав. Шкляраёва і садклад часова вык. абав. загадчыка Аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР тав. Лукашэвіча аб дзейнасьці Дрысенскага Райённага Выканаўчага Камітэту.

Дрысенскі райён знаходзіцца на мяжы з Польшчай, а часткова і Латвіяй. За часы вайны гэты райён быў вельмі зруйнаваны. За апошнія гады мацуюць значныя дасягненьні ў працы райвыканкому. Вядзеньне праца па пашырэньні казетчыных гаспадарак. У райёне маецца 3 камуны і 6 калгасаў. Па некаторых вёсках насельніцтва на перавыбарчых сходах пры прыёме наказаў дэпутатам у саветы ўключыла ў гэтыя наказы адпаведныя пункты аб арганізацыі калгасаў. Сетка машынных і іншых тавары-твараў увесь час расьце. У райёне разьвіты пасевы тахнічных ультур. Плошча засеву ільну штогодзе пашыраецца (у 1928 г. плошча засеву ільну пашырана на 12 15 проц. супроць 1927 г.).

Дрысенскі райён землеўпарадкаван на 30 проц. агульнай плошчы. Па спажывецкай кааперацыі на сельніцтва кааперавана на 83 проц., па сельгаскааперацыі—на 53 проц. Наогул у гаспадарчай працы РВК выразна адбіты тыя асноўныя задачы, якія высунуты савецкай уладай. Мясцовая прамысловасьць у райёне слаба разьвіта. Па пяцігадоваму пляну РВК вызначана пабудова шэрагу новых прадпрыёмстваў (2 цагельныя заводы, 1 чарапічны, 1 па перапрацоўцы вапны, 1 за торфаздабыцьці і інш.). Райвыканком ня досыць зьвяртаў увагі на пашырэньне сеткі сельскіх бюджэтаў; так, напрыклад, ва ўсім райёне мяшча толькі адзін местачковы бюджэт. Усе кампанійскія працы (пасяўныя кампаніі, сельска-гаспадарны падатак, страхоўка, самаабкладаньне і інш.) праведзены здавальняюча. Нездавальняюча абстаіць справа з распаўсюджваньнем дзяржаўных пазык на вёсцы, заданні ў гэтай галіне райвыканкомам не выкананы.

Слаба разгорнута масавая праца, як па лініі РВК, так і саветаў. Пры сельскіх саветах арганізаваны камісіі, але гэтыя камісіі працуюць слаба і ня выносяць сваёй працы на кантроль мас. Насельніцтва слаба знаёма з правядзімымі РВК мерапрыёмствамі, наколькі справаздачы аб дзейнасьці РВК і саветаў ставяцца на сходах радка. Па райёну заданна праведзена справа зімняя кампанія, у зьвязку з перавыбарамі саветаў. У сучасны момант РВК вядзе падрыхтоўку да перавыбараў саветаў.

Навокал дакладу РВК разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі, у якіх выказаліся т.т. Хацкевіч, Бэйлін, Чэрвякоў, Масальскі, Галадзед.

Выступаючыя члены прэзыдыуму ЦВК паказвалі на слабасьць масавай работы ў агульнай дзейнасьці РВК. Члены прэзыдыуму ЦВК падкрэсьлівалі таксама неабходнасьць павялічэньня ўвагі з боку цэнтральных і акруговых органаў Дрысенскаму райёну, як прымежаному, вельмі зруйнаваному ў час вайны.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў утварыць пад старшынствам тав. Стамфёўскага камісію для распрацоўкі праекту пастановы па заслуханаму дакладу. Камісіі даручана падаць праект пастановы на разгляд і зацьверджаньне бліжэйшага пасяджэньня прэзыдыуму ЦВ

АБ ФОНДЗЕ ІМЯ ЛЕНІНА ДАПАМОГІ БЯСПРЫТУЛЬНЫМ ДЗЕЦЯМ.

Заслухан даклад Цэнтральнай Камісіі па арганізацыі і распаряджэньні фондам імя Леніна дапамогі бяспрытульным дзецям.

Прэзыдыум ЦВК па заслуханаму дакладу адзначыў, што сродкі ў фонд імя Леніна па дзяржаўнаму і мясцовым бюджэтах паступаюць нармальна; 20 проц.-жа адлічэньні ў фонд імя Леніна са сродкаў, якія злабываюцца грамадзкімі арганізацыямі, своечасова паступаюць толькі ў рэспубліканскі фонд, што-ж тычыцца акруговых фондаў, дык у апошніх ні адзай грамадзкай арганізацыяй адлічэньні ня робіцца.

Акруговым Выканаўчым Камітэтам прапанавана прыняць рашучыя меры па ўзмацненьні збіраньня сродкаў у фонд імя Леніна на лініі грамадзкай ініцыятывы, забясьпечыўшы правядзеньне адпаведных мерапрыёмстваў.

Прэзыдыум ЦВК звяртаецца з прапановай Цэнтральнай Камісіі аб скарыстаньні банкаўскіх пропанцаў з фонду імя Леніна на стыпэндыі для дзяцей чырвоных партызан, удзельнікаў грамадзянскай вайны і г. д.

АБ ПОМНІХАХ АХВЯРАМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ.

Прэзыдыум ЦВК утварыў камісію па падрыхтоўцы адпаведных мерапрыёмстваў па увэкавечаньні памяці ахвяр грамадзянскай вайны—у складзе т.т. Платуна (старшыня), Ашаровіча, Шастакова і Раманчука.

Камісіі даручана закончыць сваю працу і аб выніках дакладзіць прэзыдыуму ЦВК у месячны тэрмін.

Як праходзіць кампанія „Агляд чырвонай казармы"

АГЛЯД ЧЫРВОНАЙ КАЗАРМЫ ЎСКАЛЫХНУЎ ЧЫРВОНААРМЕЙСКУЮ МАСУ І РАБОЧУЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ. — ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМІ ЎКОСЯЦЦА СОТНІ ПРАПАНОЎ АБ ПАЛЯПШЭНЬНІ ДАБРАБЫТУ КАЗАРМЫ.—АДЧЫНЯЮЦЦА НОВЫЯ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІЯ ЧАЙНЫЯ, АБСТАЛЁЎВАЮЦЦА СТАЛОЎКІ, ЛЕНІНСКІЯ КУТКІ, АДЧЫНЯЮЦЦА АГУЛЬНА-АСЬВЕТНЫЯ ШКОЛЫ.

У Беларускай дывізіі нашаму супрацоўніку паведамілі наступнае аб ходзе кампаніі па агляду чырвонай казармы па часьцях дывізіі:

Падрыхтоўчая праца да агляду чырвонай казармы ў часьцях № Беларускай дывізіі пачалася ў канцы сьнежня. Ва ўсіх часьцях былі вылучаны камісіі па агляду, у склад якіх увайшлі, акрамя асоб камандна-палітычнага складу, прадстаўнікі ад чырвонаармейцаў і малодшага камскладу, абраныя на агульных сходах чырвонаармейцаў. Сатаварыскія і шэфскія арганізацыі таксама вылучылі сваіх прадстаўнікоў у гэтыя камісіі

Цэнтральнае праўленьне саюзу працаўнікоў мастацтва, як культурны шэф Чырвонай арміі, на сваім апошнім пасяджэньні пастанавіла дэлегаваць сваіх прадстаўнікоў у вайсковыя камісіі па агляду чырвонай казармы і вылучыла групы на агляду для вучоты мастацкіх запатрабаваньняў кожнай чырвонаармейскай часткай.

Кампанія агляду чырвонай казармы ўскалыхнула чырвонаармейскія масы: праводзяцца спэцыяльныя вечары прапаноў, як палепшыць дабрабыт казармы. У ленкутках заведзены спэцыяльныя сшыткі і скрынкі прапаноў, у выніку чаго ў некаторых часьцях ёсьць больш 100 канкрэтных прапаноў, як уласнымі сіламі палепшыць становішча казармы.

Праз чырвонаармейскую самадзейнасьць (суботнікі) і пры дапамозе шэфскіх арганізацый праводзіцца вялікая праца па палепшаньні дабрабыту казармы.

Так, у №-скім чырвонаштандартным палку *для ўсіх чырвонаармейцаў робяцца табурэткі, афарбоўваюцца маленькія столікі, абсталёўваюцца сушылкі для сушкі анучаў, замест місак у чырвонаармейскія сталоўкі закуплены тэлеркі, а таксама медныя чайнікі, кашы і вілкі. Для ўсіх ленкутко́ў куплены па паўтары тузіны крэслаў. Апроч гэтага, абсталёўваецца чырвонаармейская чайная на 70 чалавек. Чырвонаармейскімі суботнікамі прыведзены ў парадак стайні палка. Праводзіцца конкурс на 10 больш культурных і прыкладных чырвонаармейцаў.*

У №-скім палку імя рабочых МКВ чыгункі *палепшан ўнутраны дабрабыт чырвонаармейскай сталовай, зроблены вешалкі, арганізавана чырвонаармейская чайная, папраўлены рукамыйнікі і перанесены ў цёплае памяшканьне. Усім чырвонаармейцам выдадзен зубны парашок, на кожныя два чалавекі выд дзена шчотка для чысткі ботаў, а на кожныя 5 чалавек—шчотка для чысткі адзеньня. Каля чырвонаармейскай сталоўкі пабудавана бэтонная студня. На днях чакаецца прыезд дэлегацыі рабочых чыгуначнікаў з Масквы, якія прымуць удзел у аглядзе чырвонай казармы.*

У №-скім стрэлковым палку *пойнасьцю забясьпечаецца пасудай чырвонаармейская сталоўка, прыведзены ў парадак пакаёвыя ключы. У пачатку лютага адчыняецца чырвонаармейская чайная. Ленкуткі абсталёўваюцца мэбляй. У палку адчынен прыёмны пакой на 15 чалавек. Разам з шэфскімі арганізацыямі праведзены вечары, прысьвечаныя агляду казармы.*

Чырвоны Крыж вылучыў для палка зубнога доктара для правядзеньня санацыі зубоў усім чырвонаармейцам.

У часьцях дывізіі агляд чырвочай казармы праходзіць у тым-жа парадку.

У № скім канвойным палку *абсталёвана цырульня. Па ўсіх часьцях адрамантаваны палкавыя кладкі*

Зараз у часьцях дывізіі праводзіцца масавыя экскурсіі рабочых у казармы

Работнікі асьветы прымацавалі ўсе свае групкомы і мясцкомы для культурнага абслугоўваньня чырвонаармейскіх часьцей дывізіі. Пры ўсіх часьцях адчынены чырвонаармейскія агульнаасьветныя школы.

М. А.

Антысэміты перад пралетарскім судом.

Прамова тав. Канапліна.

Грамадзкі абвінаўцель тав. Канаплін спыніўся на значэньні данага працэсу.

— Кожны працэс,—кажа т. Канаплін, зьяўляецца асколкам рэчаістасьці. У кожным працэсе выяўляюцца ўсе жыцьцёвыя пытаньні, перапляценыя з бытам.

У гэтым працэсе таксама перапляцены ўсе элементы рэчаістасьці. Гэты працэс перавяраў ўпішэ адну старонку ў гісторыі клясавай барацьбы.

Чым тлумачыць,—задае пытаньне т. Канаплін,—тыя абставіны, што ў апошні час мы маем рост антысэмітызму? Чым тлумачыцца ўздым актыўнасьці антысэміцкіх настроеў? Гэта тлумачыцца тым, што атруту антысэмітызму распаўсюджваюць групы (буржуазеі, кулацтва, папы. Атрутай антысэмітызму часамі таксама заражаюцца паасобныя невялікія групы працоўных.

Далей тав. Канаплін робіць падрабязны аналіз прычыны антысэмітызму ў старой Расеі. Царскі ўрад выкарыстоўваў антысэмітызм дзеля замяненьня клясавай сьвядомасьці рабочае клясы, дзеля таго, каб адцягнуць увагу рэвалюцыі. Падсудныя гэтага працэсу таксама імкнуліся праводзіць у сваіх дзеяньнях палітыку царскага ўраду.

Гэта вельмі шкодныя настроі, з якімі трэба весьці рашучую барацьбу.

Ўрэшце т. Канаплін адзначае, што грамадзкае абвінавачваньне ў адносінах да падсудных далучаецца да думкі дзяржаўнага пракурора: усіх падсудных трэба належна пакараць.

Прамова тав. Ігнатоўскага.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук праф. Ігнатоўскі выступіў з прамовай, у якой ён ахапіў значэньне данага працэсу.

У адным працэсе адчуваецца ўплыў спадчыны царызму, царскі ўрад заўсёды імкнуўся ўжываць для сваіх мэтаў нацыянальную варожасьць. Відомая ўсім «мяжа аселасьці», якая зьявілася на сьвет у канцы ХУШ стагодзьдзя, была накіравана ня толькі супроць яўрэйства і зьяўлялася ня толькі нацыянальным абмежаваньнем, але і сацыяльным.

Хітрая мэханіка царызму не магла не адбіцца на ўзьцікнаваньні і росьце нацыяналізму ў Беларусі. Нават самы клясава-сьвядомы пласт на Беларусі, як пралетарыят, заражаўся нацыяналізмам і антысэмітызмам. Даволі адзначыць пашыраныя на Беларусі нацыянальна-сацыялістычныя партыі: сыяністы, бунд, беларуская сацыялістычная грамада, ППС, літоўскія с. д. і г. д. Вельмі цяжка было прасунуць у масы сапраўды рэвалюцыйную, марксысцка-ленінскую тэорыю барацьбы. Тым ня менш здаровае клясавае пачуцьцё рабочае клясы на Беларусі існавала. Паступова сюды праслякаў інтэрнацыяналізм, а разам з ім і бальшавізм.

Пасьля перамогі Кастрычніка, буржуазея і контр-рэвалюцыйныя сілы заўжды выкарыстоўваюць часовыя няжкасьці рабочай улады і выкарыстоўваюць зброю царызму, яны разьдзьмухаюць нацыяналізм і антысэмітызм, і на гэтай глебе арганізоўваюць яўрэйскія пагромы. Не дарма ў 1918 годзе Ленін падпісаў спэцыяльны дэкрэт аб барацьбе з антысэмітызмам. Тут ён вызначае, што нацыянальная варожасьць разьбівае адзіны працоўны фонд, што асоб, якія вядуць пагромную агітацыю, трэба ставіць па-за законам.

Справа на гуце «Кастрычнік» ёсьць адно з выяўленьняў контр-рэвалюцыі.

Тав. Ігнатоўскі пераходзіць да характарыстыкі паасобных груп падсудных. У адносінах да Тачыліна, Тулякова і Груздова трэба ўжыць суровае пакараньне. Ніцієўская і Гладкова часткова пакаяліся. Асобна стаіць Красьнянскі і ўрэшце стаіць Пчолкін і Каронін. Прамоўца адзначае дрэнны стан выхаваўчай працы. На гуце сяцьверджаньне бліжэйшага пасяджэньня прэзыдыуму ЦВ

Прысуд.

Пасьля 8 гадзіннай нарады Вярхоўны Суд абвясьціў наступны прысуд:

Прыгавораны: Тачылін—на 3 гады зьняволеньня з залічэньнем папярэдняга трыманьня пад вартай;

Тулякоў—на 3 гады зьняволеньня, але на падставе амністыі ЦВК БССР да 10-цігодзьдзя БССР гэты тэрмін скарочаны напалову;

Груздзёў—на 2 гады зьняволеньня; па тэй-жа амністыі тэрмін пакараньня скарочан напалову;

Гладкоў—на 2 гады зьняволеньня, але па амністыі гэты тэрмін скарочан напалову і прысуд пастаноўлена лічыць умоўным;

Красьнянскі—на 2 гады зьняволеньня; па амністыі тэрмін скарочан напалову; прымаючы пад увагу яго хваравітасьць і ранейшую сумленную службу ў Чырвонай арміі, пастаноўлена прысуд лічыць умоўным;

Пчолкін — на 1 год зьняволеньня, якое заменена грамадзянскай ганьбай;

Ніцієўская — на 6 месяцаў зьняволеньня, але па амністыі падсудная ад кары вызвалена.

У адносінах Кароніна, суд лічыць абвінавачаньне недаказаным.

Пастанова суду канчатковая і абскарджаньню не падлягае.

Прамова тав. Фрыдмана.

Праваабаронца т. Фрыдман адзначае, што падсудныя ня могуць чакаць абароны за свае дзеяньні. Зразумела, тое, што яны зрабілі, зьяўляецца злачынствам, але, аднак, трэба прыняць пад увагу нізкі культурны ўзровень Тачыліна, Груздова і інш. Усе яны вельмі бедны культурай. Красьнянскі быў у Чырвонай арміі і там быў паранены. Груздоў зьяўляецца антысэмітам, але бязумоўна, палітыкі ў яго дзеяньнях няма

Тав. Фрыдман просіць суд напасаваць у адносінах да Тачыліна амністыю з прычыны 10 годзьдзя БССР. Ён просіць суд не адрываць Тачыліна, Груздова і Красьнянскага ад працы. Яны пакаюцца і будуць добрымі. Гэтыя людзі толькі спатыкнуліся, але ня упалі. Красьнянскага т. Фрыдман просіць зусім вызваліць ад пакараньня.

Знойдзены нявыданыя творы Я. Купалы

Знайшлася частка рукапісаў Я. Купалы да-рэвалюцыйнага часу, якія не маглі друкавацца пры ц рскай цэзуры і аб якіх аўтар думаў, што ўжо загінулі. Знайшліся гэтыя рукапісы сярод багатага архіву і кніг абшырнай бібліятэкі вядомага піянэра беларускага адраджэньня і асьвяцкага ўсіх бел. пісьменьнікаў да-рэвалюцыйнай эпохі Б.І. Эпімах-Шыпілы. Сярод знойдзеных матар'ялаў вось верш («Перад вісальняй»), які аутар, працуючы ў «Нашай Ніве», друкаваў на нашаніўскім шапірографе бо ведама піраўнікоў газэты і размножыў сярод знаёмых. Апрача рэвалюцыйных, вось вершы дражніўга характару аб дзіўчатах і хлапцох, але да друку мажліва, а таксама эпіграмы, пераклады з Нікрасава і інш.

Творы гэтыя Купала зьбірэцца з належнымі ўвагамі апублікаваць у адным з бліжэйшых нумароў «Полымя».

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ Ў АСЬВЕТНІКАЎ МЕНСКУ.

20 студзеня адбудзецца ў удзелам асьветнікаў Менску адчынены сход ячэйкі працасьветы, дзе будзе заслуханы даклад „5 год бяз Леніна". 21 студзеня па ўсіх калектывах асьветнікаў адбудуцца жалобныя сходы. У школах у гэты дзень будуць накладжаны ранішнікі, прысьвечаныя памяці Леніна. Наступ цтва школ прыцягваецца для шырокай папулярызацыі і распаўсюджваньня твораў Леніна і аб Леніне. 22 студзеня адбудзецца агульна-гарадзкі сход асьветнікаў з адпаведным дакладам.

ДА КОНКУРСУ НА ЛЕПШУЮ СЭКЦЫЮ ГАРСАВЕТУ.

На апошнім пленуме Менскага гарсавету быў заслуханы даклад члена цэнтральнай конкурснай камісіі т. Лукашэвіча аб мэтах і задачах правядзеньня конкурсу на лепшы савет, сэкцыю і камісію.

Пасьля гэтага была заслухана інфармацыя камісіі сацыяльнічаньня правядзеньню конкурсу Менскага гарсавету.

Пленум адобрыў працу камісіі сацыяльнічаньня і пастанавіў конкурсную працу яшчэ больш узмацніць, увагу яе з справаздачна-абразьбовай камісіяй гарсавету. Пастаноўлена таксама ў правядзеньне конкурсу ўдзагачць шырокія масы працоўных Мінску

Прыезд брыгады рэдакцыі „Красноармейская Правда".

Гэтымі днямі ў Менск прыехала выязная брыгада рэдакцыі чырвонаармейскай газэты Беларускай Вайсковай Акругі «Красноармейская Правда».

У Менску брыгада знаёміцца з ходам кампаніі па агляду чырвонай казармы на Менскаму гарнізону.

Усебеларускі зьезд навуковых працаўнікоў.

На 14-га лютага скліканна ў Менску ўсебеларускі зьезд навуковых працаўнікоў. Па зьезьдзе будзе заслуханы даклад Усесаюзнага Саўнаргу і справаздача ЦБ навуковых працаўнікоў БССР. Акрамя гэтага, будзе заслуханы даклад Наркамасьветы і даклад аб навукова-дасьледчай працы ў БССР.

Модус пэдстаўніцтва—1 дэлегат ад 10 чалавек

Арганізацыя радыёўнівэрсытэту ў Менску.

Па прыкладу Масквы і Ленінграду, у Менску таксама арганізоўваецца радыёўнівэрсытэт. Зараз в